

ПАРАД АДКРЫЕ Т-34

4

ЯК ШТУРМУЮЦЬ «ДАХ СВЕТУ»

12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

1 ЧЭРВЕНЯ 2019 г. СУБОТА № 101 (28968)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый КІЙКА, намеснік міністра фінансаў:**

*«Прапанова ўрада аб адвязцы выплаты дарожнага збору ад тэхагляду пакуль не знайшла падтрымкі. Зараз мы працуем над альтэрнатыўнымі варыянтамі, у тым ліку прапрацоўваем пытанне магчымага ўключэння дзяржаўнай пошліны ў кошт аўтамабільнага паліва. У найбліжэйшы час будуць абмяркоўвацца іншыя механізмы. Пакуль пытанне адкрытае. Не выключана, што рашэнні па гэтым пытанні будуць прыняты на працягу года. Аптымальны тэрмін з пункту гледжання бюджэтнага планавання — з 1 студзеня 2020 года».*

# ЛЕТА ПРЫЙШЛО!



Фота Анатоля КЛЯШЧУКА.

**Вучні малодшых класаў мінскай сярэдняй школы № 62, якая знаходзіцца ў мікрараёне Курасоўшчына, радуюцца пачатку летніх канікул.**

## КОРАТКА

- Прафіцыт рэспубліканскага бюджэту Беларусі ў студзені — красавіку склаў Br2,2 млрд.
- **ФПБ прапрацоўвае механізм перагляду страхавога стажу пры асаблівых умовах працы.**
- ДАІ ў выхадныя ўзмоцніць кантроль на дарогах і ў зонах адпачынку.
- **Акцыі Баранавіцкага завода запчастак «Аўтака» прададуць праз валютна-фондавую біржу.**
- Упершыню ў гісторыі УС Беларусі знакам «Доблесць і майстэрства» ўзнагароджана дзяўчына Наталля Анішчук — старшы механік-тэлеграфіст гвардыі, малодшы сяржант кантрактнай службы з 38-й асобнай гвардзейскай дэсантна-штурмавой брыгады.



Медыяпрастора

## «ВАШЫ ФЭЙКІ — У НАШЫХ РУКАХ»

### Хто стаў уладальнікам медыяадукацыйнага «Оскара»?

**«Кожны дзень мы сутыкаемся з вялізнай плынню інфармацыі. Але ці ўсё з таго, што нам кажуць, праўда? Прааналізаваўшы некаторыя навіны, мы прыйшлі да высновы, што на веру трэба прымаць далёка не ўсё. Неабходна вучыцца чытаць паміж радкоў, а гледзячы тэлевізар ці відэаролік, думаць, што насамрэч стаіць за кадрам. Гэтую думку мы і паспрабавалі данесці да нашых аднакласнікаў падчас інфармацыйнай гадзіны. Падабралі яркія прыклады таго, як аўтары свядома ці несвядома скажаюць інфармацыю, спрабуючы паўплываць на нашы думкі і меркаванні.**

**На жаль, многія не задумваюцца, што да інфармацыі, як і да ежы, якую мы спажываем, трэба ставіцца вельмі сур'ёзна. Мы ж не кідаем у рот абы-што, а сочым за якасцю прадуктаў. У нашых бабуль і дзядуляў радыё працуе з раніцы да вечара, як фон. У многіх сем'ях гэтак жа працуе тэлевізар. Але ці можна крытычна ўспрымаць інфармацыю, калі яна няспынна льецца вам у вушы? Мы выступаем за асэнсаванае яе спажыванне: не проста слухаць, глядзець і чытаць, а рабіць гэта праз прызму логікі і здаровага сэнсу...» Так разважаюць Таццяна і Андрэй Сідаровічы, навучэнцы 8 класа мінскай сярэдняй школы № 12, удзельнікі конкурсу медыяасветы «Лаві фэйк».**

СТАР. 7

Нетыповыя беларусы

## «УСЮДЫ ЖЫВУЦЬ ПРЫЕМНЫЯ, ПРЫЯЗНЫЯ ЛЮДЗІ»

### Беларускі падарожнік — пра свае паездкі ў самыя экстрэмальныя рэгіёны і правілы падрыхтоўкі да іх



**Мінчанін Леанід Пашкоўскі, які год таму стаў лепшым travel-блогерам па версіі чытачоў часопіса National Geographic Traveler, здымаў вулічныя банды ў Панаме і Гаіці, пабываў у трушчобах Мумбаі і Венесуэлы, у вёсцы індзейцаў у джунглях Коста-Рыкі, вывучаў кунг-фу ў ваколіцах Шаалінь... Сваёй мэтай беларускі падарожнік ставіць развянчанне стэрэатыпаў і забабонаў пра жыхароў гэтых малазразумелых для нас краін.**

Нядаўна Леанід выступіў у Мінску з лекцыяй, у якой расказаў пра свае падарожжа па Тыбеце, М'янме, Тайландзе, Кітаі і Бангладэш. Мы выбралі некалькі парад для тых, хто таксама марыць аб далёкіх падарожжах. Яшчэ вы даведаецеся пра жывога Буду і пра тое, жыхароў якой краіны Леанід лічыць найбольш падобнымі на беларусаў.

Самае важнае, на думку Леаніда, — гэта папярэдняя падрыхтоўка перад паездкай, асабліва калі едзеш у краіну, пра якую мала што ведаеш і пра якую іншыя мала што ведаюць. З чаго яна складаецца?

СТАР. 13

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем цікавае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – НЕ ПАШКАДУЕЦЕ!

# ЧАГО КАШТУЕ ДЭМАКРАТЫЯ

## Прэзідэнт анансаваў змены ў Канстытуцыі

**Бягучы год знакавы для Беларусі. У 2019-м адзначаецца 25-годдзе з заснавання інстытута Прэзідэнцтва. Столькі ж спаўняецца Асноўнаму Закону краіны, у якім, уласна, гэты інстытут і быў замацаваны, і Канстытуцыйнаму Суду. Таму невыпадкова, што менавіта ў Мінску адбылася міжнародная канферэнцыя «Сучаснае канстытуцыйнае развіццё: роля канстытуцыйнага кантролю ў канстытуцыяналізацыі права», якая завяршылася ўчора. Сярод замежных удзельнікаў — дэлегацыі з 11 краін. Сваіх прадстаўнікоў на мінскую канферэнцыю адправіў і незалежны кансультацыйны орган Савета Еўропы — Еўрапейская камісія за дэмакратыю праз права (Венецыянская камісія). У апошні дзень форуму гасцей мерапрыемства ў Палац Незалежнасці на адкрытую, шчырую размову запрасіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.**
**На сустрэчы прысутнічалі першы намеснік старшыні Венецыянскай камісіі Хёрдзіс К'ерульф-Таргейрсдоцір, старшыні канстытуцыйных судоў Беларусі (Пётр Міклашэвіч), Латвіі (Інета Зіемеле), Балгарыі (Барыс Велчэў), Азербайджана (Фархад Абдулаеў), Босніі і Герцагавіны (Златка Кнежэвіч). Расію прадстаўляў намеснік старшыні Канстытуцыйнага суда Сяргей Маўрын, Кыргызстан — Куанбек Кіргізбаеў, намеснік старшыні Канстытуцыйнай палаты Вярхоўнага суда, а Казахстан — старшыня Канстытуцыйнага савета Кайрат Мамі.**

### СУСВЕТНЫ ВОПЫТ ДЛЯ БЕЛАРУСКАГА ЗАКОНА

Размова Прэзідэнта Беларусі і прадстаўнікоў судовай улады з іншых краін была цікавая і карысная для абодвух бакоў. Асаблівую значнасць і актуальнасць гэта сустрэча мае цяпер, калі наша дзяржава знаходзіцца на парозе змен у прававой сферы.

«Зараз у нас перыяд, калі мы думаем пра новы этап развіцця ў сувязі з тым, што жыццё ідзе бурна, вельмі паскорыліся працэсы. Наша Канстытуцыя пачынае крыху адставаць. Я папрасіў менавіта спецыялістаў Канстытуцыйнага Суда, каб яны ўнеслі свае прапановы па магчымым удасканальванні нашай Канстытуцыі. А потым мы сядзем і абмяркуем, — паведаміў беларускі лідар. — Думаю, што ў найбліжэйшы час у Беларусі з'явіцца ці новая Канстытуцыя, ці мы пойдзем, як у вас прынята казаць, амерыканскім шляхам унясення паправак у Канстытуцыю».

Прэзідэнт адзначыў, што пытанні права ў кантэксце палітычнай сістэмы свету — тэма заўсёды актуальная і важная для стварэння справядлівага грамадства, дзе кожны грамадзянін знаходзіцца пад надзейнай абаронай дзяржавы, а непахіснасць палітычнага ладу гарантуе Асноўны Закон.

«Мы высока цэнім вашу гатоўнасць дзяліцца сваім вопытам у сферы канстытуцыйнага правасуддзя. Ён для нас, безумоўна, цікавы. Асаблівую ўвагу ўдзел у форуме Еўрапейскай камісіі за дэмакратыю праз права, з якой мы выбудоўваем досыць канструктыўнае ўзаемадзеянне. Разлічваем на працяг міжнароднага супрацоўніцтва ў гэтай галіне», — падкрэсліў лідар краіны і выказаў надзею, што добрыя адносіны з кіраўнікамі канстытуцыйных судоў захаваюцца і далей.

Прыняты чвэрць стагоддзя таму Асноўны Закон надаў магутны імпульс станаўленню дэмакратычных інстытутаў у краіне, а яго адначасова — Канстытуцыйны Суд — спрыяе ўмацаванню беларускай дзяржаўнасці.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што прымаў удзел у распрацоўцы дзеючай беларускай Канстытуцыі: «Вы ведаеце, хоць нас часта пакрытыкоўваюць па розных кірунках, як і многіх з вас: ці мала дэмакратыі, ці многа, ці мала правоў чалавека і так далей. Павінен заявіць вам, як былы парламентарый, які мае дачыненне да распрацоўкі Канстытуцыі яшчэ да маёй прэзідэнцкай службы: мы найдасканалейшым чынам вывучылі канстытуцыі ўсіх краін. І я ў гэтым асабіста прымаў удзел».

Навацый у Асноўным Законе Беларусі няма, бо многія прынцыпы былі запазычаны ў канстытуцыях іншых краін, у тым ліку ў аплотаў дэмакратыі — Францыі і ЗША. «Таму, крытыкуючы нас, вы паглядвайце часам у канстытуцыі тых дзяржаў, у якіх мы вучыліся», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Распрацоўваючы палажэнні Асноўнага Закона, безумоўна, Беларусь зыходзіла і з тагачаснай рэчаіснасці. Пры размове з замежнымі гасцямі Прэзідэнт звярнуў увагу на тую фрагментарную інфармацыю, якая вядома пра наш лад у свеце: «У гэтай сувязі адкажу на пытанне, якое ў кожнага з вас, мабыць, ёсць наконт нейкага аўтарытарызму ўлады ў нашай краіне. Я ніколі гэтага не адмаўляў. Сапраўды, у нас прававая сістэма была выбудавана менавіта такім чынам, мэтанакіравана на стварэнне, захаванне, умацаванне вертыкалі ўлады. Чаму? Таму што пасля распаду Савецкага Саюза мы засталіся адзін на адзін з праблемамі». У тыя цяжкія часы ў магазінах краіны, заўсёды забяспечанай прадуктамі народнага спажывання, былі пустыя паліцы: «Есці няма чаго было, а мяне сталі вучыць дэмакратыі і рознага чыну правам чалавека ў галоднай краіне. Асноўнае права было накарміць і апрануць людзей, чым я і займаўся».

### ГАЛОЎНЫ ФАКТАР — ЧАС

Па словах Прэзідэнта, для змен патрэбен час і «штурмам нічога не возьмеш». У якасці прыкладу ён прывёў сітуацыю ва Украіне: «Найбагацейшая краіна не толькі ў Еўропе, але і свеце. Яны штосьці няправільна робяць? Так, усё робяць правільна. Так ці іначай мы ўсе ідзём па гэтым шляху. І нас таксама хтосьці звонку падштурхоўвае і гэтак далей. Але палітыка і палітыкі існуюць, каб прыстасаваць гэта для сваёй краіны. Таму галоўны фактар — гэта час».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што да дэмакратыі кожная краіна праходзіць свой шлях: хтосьці хутчэй, хтосьці павольней. Некаторыя краіны ўжо паспелі апячыся на гэтай дарозе, нават у Еўропе.

«Ці возьміце Французскую Рэспубліку — аплот дэмакратыі. Вы ведаеце, я не хацеў бы, каб у Беларусі падобнае адбывалася. Гэта ў Францыі, заўсёды прасунутай, спакойнай краіне! Паглядзіце, што адбываецца ў Злучаных Штатах Амерыкі, — канстатаваў Прэзідэнт.— Я на Мюнхенскай канферэнцыі аднойчы сказаў: «Вы, нас крытыкуючы, не забывайце наш вопыт, бо вам давядзецца ў якой-небудзь частцы вярнуцца да нашага вопыту, каб захаваць мір і стабільнасць у сваіх дзяржавах. Для народа галоўнае — мір і стабільнасць, і права павінна на гэта працаваць перадусім».

Адносіны ў дзяржаве павінны будавацца на аснове закона. І ў гэтым кірунку дзейнічае Беларусь. Прэзідэнт запэўніў гасцей: «Дэмакратыі і свабоды ў Беларусі ніколькі не менш, чым у нашай роднай братэрскай Расіі, на Захадзе і далей, у краінах, якія развіваюцца. Ніколькі не менш. Можа быць, мы больш жорстка патрабуем парадку».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што памылкі дзяржаве могуць каштаваць дорага. Вось чаму і рэформы мы прасоўваем павольна. Кіраўнік краіны падкрэсліў: «Крок за крокам. Ідзём як па тонкім лёдзе, як па лязе нажа. Каб не аступіцца, не дапусціць памылкі. Няма грошай потым на выпраўленне, ды і часу няма. Адстанем — не дагонім».

Ісці павольна, але ісці — такі прынцып дзяржаўнай палітыкі нашай краіны.

### ЗАКОНЫ — ЖЫВАЯ МАТЭРЫЯ

Найважнейшае паўнамоцтва Канстытуцыйнага Суда — прыняцце штогадовых пасланняў аб стане канстытуцыйнай законнасці. Агучаныя ў іх высновы і прапановы па развіцці прававой сістэмы дзяржавы — значны фактар удасканалення нарматворчай і праваапрымяняльнай дзейнасці.

«Законы — гэта жывая матэрыя. Яны чыняць лёсы людзей, краін і свету. Ад вас усіх, хто стварае, удасканальвае і, галоўнае, кантралюе іх выкананне, залежыць, наколькі гарманічна будзе развівацца сучаснае грамадства, наколькі справядлівы будзе свет, у якім мы жывём, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Апошнім часам адбываецца не зусім так. І да чаго гэта прыводзіць? Да гандлёвых войнаў, хаосу і гэтак далей. Калі мы, палітыкі, ігнаруем закон, прававыя акты, якія прызнаны ў свеце, на міждзяржаўным узроўні, тыя пагадненні, якія заключаны і маюць сілу закона ў тых ці іншых дзяржавах, адбываецца вельмі дрэннае. Гэта канфлікты, гэта войны, слава богу, пакуль толькі лакальныя ў тым ці іншым рэгіёне... Калі так пойдзе далей, мы прыйдзем да новай сусветнай вайны».

Аляксандр Лукашэнка заклікаў трымацца закона, захоўваць стабільнасць у свеце дзеля таго, каб гэтага не дапусціць.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### Каментарый у тэму

Пасля размовы ў Прэзідэнта да журналістаў звярнуўся старшыня Канстытуцыйнага Суда Беларусі Пётр Міклашэвіч: «Кіраўнік дзяржавы ўжо пазначыў пэўнае бачанне змяненняў. Неабходна ўдасканаліць дзяржаўны механізм улады, каб усе галіны ўлады актыўна выконвалі свае функцыі. Для гэтага неабходна на канстытуцыйным узроўні зрабіць пэўнае пераразмеркаванне паўнамоцтваў і для ўрада, і для парламента. Адпаведна, стаіць пытанне аб тым, што ў Канстытуцыі вызначана сістэма дзяржаўнага ладу і неабходна выпрацаваць павышэнне эфектыўнасці дзяржавы ў цэлым. Гэта першы кірунак. Другое: неабходна ўдасканальванне, мадэрнізацыя грамадства, каб народ актыўна ўдзельнічаў у выбарчай сістэме».

Першы намеснік старшыні Венецыянскай камісіі Хёрдзіс К'ерульф-Таргейрсдоцір адзначыла: «У дыскусіях, якія адбыліся паміж мной і Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, неаднаразова рабіўся акцэнт на важнасці грамадскіх абмеркаванняў, важнасці актыўнага ўдзелу грамадзянскай супольнасці ў дэмакратычных працэсах. Самая галоўная пагроза дэмакратыі — пасіўнасць грамадства».

Кайрат Мамі, старшыня Канстытуцыйнага савета Казахстана, адказваючы на пытанні карэспандэнтаў, расказаў: «Кожны раз, калі прыязджаем у вашу краіну, бачым вялікія пазітыўныя змены ў развіцці грамадства, дзяржавы, павышэнні дабрабыту грамадзян. Гэтаму спрыяе Канстытуцыя». Ён упэўнены: «Канстытуцыя павінна быць кансерватыўнай. Але, тым не менш, Канстытуцыя — не застылы арганізм, і калі яна адстае ад жыцця, значыць, узнікае неабходнасць перагляду, змен. Як я разумею, такая камісія ўжо працуе ў Беларусі».

## Парламенцкі дзённік

# ДАРОЖНЫ ЗБОР, САЮЗНАЯ ДЗЯРЖАВА, ВЫТВОРЧАСЦІ

**У тым ліку і гэтыя пытанні закранулі ўчора ў Палаце прадстаўнікоў, дзе прайшло сумеснае пасяджэнне Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі.**

Перад парламентарыямі з дакладам на тэму «Эфектыўнае дзяржаўнае кіраванне лесагаспадарчай дзейнасцю як частка эканамічнай бяспекі дзяржавы» выступіў намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Дворнік. Пры гэтым лес стаў не адзінай тэмай мерапрыемства.

Так, падчас пасяджэння члены ўрада адказалі на пытанні парламентарыяў, а яшчэ да яго пачатку — на пытанні журналістаў. Тэзісна расказваем пра найбольш важнае.

Намеснік міністра фінансаў Дзмітрый Кійко паведаміў журналістам, што прапанова яго ведамства аб раздзеле тэхагляду і дзяржпошліны на допуск да дарожнага руху не знайшла падтрымкі ў вышэйшай інстанцыі. «Цяпер мы працуем над альтэрнатыўнымі варыянтамі, у тым ліку прапрацоўваем пытанне магчымага ўключэння дзяржаўнай пошліны ў кошт аўтамабільнага паліва», — сказаў ён. Такім чынам, пытанне адкрытае. Магчыма, цяперашняя сітуацыя са спаганнем дарожнага збору зменіцца з 1 студзеня 2020 года.

Таксама намеснік міністра фінансаў адзначыў, што зараз ідзе работа над удакладненнем праграмы рэалізацыі Дагавора аб Саюзнай дзяржаве. Ён дадаў, што пытанне аб кампенсацыі страт Беларусі ад падатковага манеўру ў Расіі пакуль выстаўлена на паўзу.

Ужо на самім пасяджэнні, адказваючы на пытанне дэпутата, міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй Худык выказаўся наконт стварэння новых вытворчасцяў. Ён адзначыў, што ёсць рэзанансныя інвестпраекты, аднак Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя праводзіць па ўсіх дзяржаўную экалагічную экспертызу, даводзіць кожны праект да захавання ўсіх нормаў прыродаахоўнага заканадаўства.

Міністр расказаў, што ў найбліжэйшы час яго ведамства выйдзе з прапановамі ва ўрад і зробіць кантроль за стварэннем і ўводам новых вытворчасцяў больш жорсткім.

Таксама на пасяджэнні закраналіся такія тэмы, як арганічная сельская гаспадарка, праграма замены ліфтаў (дарэчы, да 2021 года неабходна замяніць больш чым 11 тысяч ліфтаў па краіне) і прыватызацыя службовага жылля работнікамі ЖКГ.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

## Фінансы

# Нашы даўгі скарачаюцца

**Знешняя дзяржаўная запазычанасць Беларусі на 1 мая склала 16,7 млрд долараў, знізіўшыся з пачатку года на 0,2 млрд долараў (з улікам курсавых розніц), або на 1,3 %, паведамілі спецыялісты Міністэрства фінансаў краіны.**

У студзені — красавіку нашай краінай былі прыцягнутыя замежныя дзяржаўныя пазыкі на суму амаль 300 млн долараў. У той самы час пагашэнне знешняга дзяржаўнага доўгу склала 588 млн долараў, з якіх 249,4 млн долараў — ураду Расіі, а 212,8 млн долараў — экспартна-імпартнаму банку Кітая.

Дзяржаўная запазычанасць краіны на гэтую дату склала 43,7 млрд рублёў і паменшылася ў параўнанні з пачаткам года на 1,7 млрд рублёў, або на 3,8 %. Унутраны дзяржаўны доўг па стане на 1 мая склаў 8,5 млрд рублёў. Такім чынам, ён паменшыўся з пачатку года на 0,4 млрд рублёў, або на 4,3 %.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Абітурыент-2019

# На піку папулярнасці — біялогія

**Агульны конкурс у Ліцэй БДУ склаў 6,6 чалавека на месца. Як паведамілі у прэс-службе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, гэты паказчык адпавядае мінулагодняму. Усяго ў бягучым годзе ў ліцэй было пададзена 1520 заяў ад ахвотных тут навучацца. Найбольшая колькасць дакументаў прынятая ў біялагічны клас — 330. Конкурс на біялагічны профіль склаў 9,4 чалавека на месца.**

На паступленне ў матэматычныя класы прэтэндавалі 277 абітурыентаў (конкурс — 7,9 чалавека на месца), у фізічныя — 237 (конкурс — 6,1), інфарматыка-матэматычны — 167, хімічны — 119, гісторыка-грамадазнаўчы — 97 і філалагічны — 78.

У гэтым годзе ў Ліцэі БДУ упершыню праводзіўся набор па двух новых профілях навучання ў гуманітарных класах. Першы арыентаваны на вывучэнне грамадазнаўства і англійскай мовы, другі — на гісторыю Беларусі і англійскую мову. У гэтыя класы пададзена 159 і 59 заяў адпаведна.

З агульнай колькасці абітурыентаў 40 чалавек былі залічаны без экзаменаў: яны з'яўляюцца пераможцамі заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды (дыпломы І, ІІ або ІІІ ступені) па фізіцы, матэматыцы, інфарматыцы, хіміі, біялогіі, гісторыі, грамадазнаўстве, рускай мове і літаратуры, беларускай мове і літаратуры, англійскай мове.

Залічэнне ў 10-я ліцэйскія класы адбываецца па выніках двух пісьмовых уступных выпрабаванняў. Пры паступленні на біялагічны профіль сёлета неабходна было набраць 126 балаў, філалагічны — 125, гісторыка-грамадазнаўчы — 124, матэматычны — 104, хімічны — 96, фізічны — 90, інфарматыка-матэматычны — 80.

Усяго ў гэтым годзе ў Ліцэй БДУ ў 10 класы будуць прынятыя 264 навучэнцы, з іх сфарміруюць 12 класаў па 22 чалавекі. Сярод будучых ліцэістаў жыхары сталіцы складаюць 73 % ад агульнай колькасці і 27 % — прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў.

Між іншым, у 2020/2021 навучальным годзе ў Ліцэі БДУ адкрыецца яшчэ адзін новы профіль навучання — матэматыка з вывучэннем англійскай мовы на павышаным узроўні. Падрыхтавацца да паступлення можна будзе на курсах «Вячэрні Ліцэй».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Звярніце ўвагу!

# АДЗЁР ПАД КАНТРОЛЕМ

**Сёлета на адзёр захварэлі 106 беларусаў, інфекцыя ў іх лабараторна пацверджана. У 35 выпадках захворванне да нас завезлі, астатнія выпадкі звязаныя з імі. І хоць гэта значна менш, чым за аналагічны перыяд летась, спецыялісты раяць памятаць пра небяспечную інфекцыю, а пры ад'ездзе за мяжу ўдакладніць свой прышчэпкавы статус і пры неабходнасці прышчапіцца.**

Адзёр сёлета рэгістравалі ва ўсіх рэгіёнах: у Мінску выяўлена 22 выпадкі, у Гомельскай вобласці — 21, у Гродзенскай і Брэсцкай — па 17, у тым ліку ў Гродне — 15, у Мінскай і Віцебскай — па 13, у Магілёўскай — 3.

Улічваючы сітуацыю з высокай захваральнасцю на адзёр у Еўропе, ІІ Еўрапейскія гульні, якія прыме Беларусь у чэрвені, а таксама актыўны выезд за мяжу падчас адпачынкаў, медыкі прагназуюць, што завоз віруса адру можа павялічыцца. У нашай краіне арганізаваны і праводзяцца ў поўным аб'ёме санітарна-супрацьэпідэмічныя мерапрыемствы, што не дазваляе хваробе набыць маштабы эпідэміі.

— Калі вы не ведаеце пра сваё прышчэпкі супраць адру і плануеце паездкі за межы Беларусі, мэтазгодна звярнуцца да ўчастковага ўрача, у здраўпункт па месцы вучобы ці працы, удакладніць наяўнасць у вас прышчэпак і пры неабходнасці вакцынавацца, — рэкамендуе **намеснік начальніка аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя Іна КАРАБАН.** — Калі пасля вяртання з-за мяжы з'явіліся сімптомы інфекцыйнай хваробы (павысілася тэмпература, маецца сып, боль у горле, кашаль, кан'юктывіт), варта неадкладна звярнуцца да ўчастковага ўрача ці інфекцыяніста і акцэнтаваць увагу на нядаўняе вяртанне з замежнай краіны.

Каб папярэдзіць захворванне тых, хто задзейнічаны ў правядзенні ІІ Еўрапейскіх гульняў і будзе па родзе сваёй дзейнасці кантактаваць з удзельнікамі і гасцямі мерапрыемства, арганізавана вакцынацыя супраць адру.

Паводле звестак Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, са студзеня 2018 года ў 47 з 53 краін Еўропы было зарэгістравана больш чым 100 тысяч выпадкаў адру, 90 чалавек памерлі. За тры месяцы бягучага года выяўлена больш чым 51 тысяча выпадкаў. Найбольшая колькасць — ва Украіне (34,1 тысячы), Казахстане (больш чым 5,3 тысячы), Грузіі (больш чым 2,9 тысячы), Кыргызстане (больш чым 1,5 тысячы), Расіі (больш чым тысяча), а таксама Польшчы, Францыі, Ізраілі, Румыніі і інш. Адзёр — захворванне не толькі вельмі небяспечнае, але і з найвышэйшай кантагіёзнасцю: здаровы чалавек пры кантакце з хворым непазбежна заразіцца.

**Алена КРАВЕЦ.**

Добрая навіна

# Яшчэ адзін біятлонны пункт на карце

**У аграгарадку Мір Баранавіцкага раёна адкрыўся рэканструяваны спартыўна-біятлонны комплекс**

**Пяць гадоў таму на гэтым месцы была абсталявана летняя лыжаролерная траса, Аляксандр Лукашэнка ў час рабочай паездкі ў Брэсцкую вобласць 22 сакавіка бягучага года азнаёміўся са спартыўным аб'ектам і даручыў яго рэканструяваць. Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС расказаў, што за красавік — май гэтая задача была выканана.**

У комплексе з'явілася стрэльбішча і абнавілася лыжаролерная траса. *«Створаны ўмовы не толькі для правядзення спаборніцтваў, у любы час чалавек можа прыйсці і адпачыць, пазаймацца спортам, тут працуе пункт пракату лыжаролераў і ролікаў. Гэты аб'ект заклікаць прывучыць дзяцей, моладзь, людзей старэйшага пакалення да заняткаў спортам, а гэта ўмацаванне здароўя нацыі»,* — адзначыў **Анатоль ЛІС.**



Фота БелТА.

На рэканструкцыю спартыўна-біятлоннага комплексу было накіравана каля 800 тысяч беларускіх рублёў, у ходзе рэканструкцыі добраўпарадкавана стрэльбішча з 20 мішэннымі ўстаноўкамі, што дазволіла выкарыстоўваць у трэніровачным працэсе не толькі пнеўматычную зброю, але і дробнакаліберныя вінтоўкі. Трасу працягнулі да 2 км, зімой яна павялічыцца да 5 км. Закупілі снежную пушку, зараз рыхтуецца артэзіянская свідравіна, каб можна было рабіць штучнае аснежванне. Беларуская федэрацыя біятлона зрабіла спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школе алімпійскага рэзерву Баранавіцкага раёна падарунак — аўтобус МАЗ для падвозу юных спартсменаў.

*«На карце Беларусі з'явіўся яшчэ адзін пункт, які адпавядае самым высокім патрабаванням для падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву,* — адзначыў **намеснік міністра спорту і турызму Аляксандр БАРАУЛЯ.** — *Для Брэсцкай вобласці гэты комплекс ператварыўся ў рэгіянальны цэнтр па біятлоне і лыжных гонках. Спадзяюся, што дзякуючы такім зменам адсюль выйдуць новыя зорачкі, якія будуць бліскаць і радаваць нас на чэмпіянатах свету і Еўропы, Алімпійскіх гульнях».*

На цырымоніі адкрыцця комплексу прысутнічаў таксама старшыня Брэсцкай абласной федэрацыі біятлона, начальнік упраўлення КДБ па Брэсцкай вобласці Сяргей Гладышаў і старшыня Баранавіцкага райвыканкама Васіль Хвацік.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### МАЛАЙЗІЯ ПРАПАНУЕ СТВАРЫЦЬ АДЗІНУЮ АЗІЯЦКУЮ ВАЛЮТУ



Магчымасць стварэння адзінай валюты для Усходняй Азіі прапануе абмеркаваць прэм'ер-міністр Малайзіі Махатхір Махамад, паведаміў «Коммерсант». Выказванне прагучала на канферэнцыі «Будучыня Азіі», якая штогод праходзіць у Токіа. Махамад назваў цяперашнюю валютную сістэму ў рэгіёне маніпулятыўнай з прычыны прывязкі да долара, які ў апошні час схільны да ўздзеяння знешніх фактараў. Палітык нагадаў пра шматлікія ўведзеныя ЗША санкцыі, якія таксама не спрыяюць стабільнасці амерыканскай валюты. Новая азіяцкая валюта можа выкарыстоўвацца для ўнутраных трансакцый, лічыць Махамад. «Калі мы хочам наладжваць адносіны тут, на Далёкім Усходзе, мы павінны пачаць з адзінай гандлёвай валюты», — заявіў прэм'ер Малайзіі. Ён дадаў, што новая валюта павінна быць прывязаная да золата, бо гэты метал сёння больш стабільны, чым долар.

### КАНЦЛЕРАМ АЎСТРЫІ ЎПЕРШЫНЮ СТАЛА ЖАНЧЫНА



Прэзідэнт Аўстрыі прыняў рашэнне прызначыць старшыню канстытуцыйнага суда 69-гадовую Брыгіту Бірляйн часовым канцлерам рэспублікі для фарміравання пераходнага ўрада да датэрміновых выбараў у Нацыянальны савет (ніжнюю палату парламента). Яна стане першай жанчынай на пасадзе канцлера Аўстрыі. Пра гэта заявіў прэзідэнт Александэр Ван дэр Белен па выніках кансультацый з лідарамі аўстрыйскіх палітычных партый. У найбліжэйшы час задача часовага канцлера — фарміраванне пераходнага кабінета міністраў Аўстрыі і прадстаўленне новых кандыдатур на зацвярджэнне прэзідэнтам. Затым Бірляйн і яе ўрад будуць прыведзены да прысягі, каб забяспечыць работу выканаўчай галіны ўлады да датэрміновых парламенцкіх выбараў. Паводле яе слоў, прапанова стаць часовым канцлерам рэспублікі для яе была нечаканай, але яна з усёй адказнасцю гатова ўзяць на сябе гэтую працу, каб служыць на карысць народа і Аўстрыі. Як заявіла новы канцлер, былы старшыня адміністрацыйнага суда Аўстрыі Клеменс Яблонер павінен стаць віцэ-канцлерам і міністрам юстыцыі, а пасол Александэр Шаленберг — міністрам замежных спраў. Яна таксама абвясціла, што кандыдаты на іншыя міністэрскія пасады будуць прадстаўлены ў найбліжэйшыя дні.

### НАЗВАНАЯ НАЙЛЕПШАЯ ПЕСНЯ Ў ГІСТОРЫІ ЧАЛАВЕЦТВА

Найлепшай кампазіцыяй у гісторыі чалавецтва стала песня Yesterday брытанскага гурта The Beatles, выпушчаная ў 1965 годзе. На яе запісалі 665 кавераў. У хіт-парадзе Billboard Hot 100 кампазіцыя знаходзілася на працягу 11 тыдняў. Yesterday, аўтарам якой выступіў Пол Макартні, увайшла ў альбом Help! у Еўропе, а ў ЗША была выпушчаная ў выглядзе сінгла. Другі радок заняла кампазіцыя Bridge Over Troubled Water ад дуэта Simon & Garfunkel, якая выйшла ў 1970 годзе. На яе запісалі больш за 400 кавераў і яна пратрымалася ў Billboard Hot 100 14 тыдняў. Трэцяе месца заваявала кампазіцыя брытанскай спявачкі Адэль Rolling In The Deep 2010 года. Яна знаходзілася ў хіт-парадзе 65 тыдняў і мае 84 кавера. У топ-10 таксама трапілі песні Hey Jude і Let It Be ад The Beatles, All of Me амерыканскага спевака Джона Леджэнда, Bad Romance выканаўцы Лэдзі Гагі, Bohemian Rhapsody калектыву The Queen і Ain't No Sunshine Біла Уізерса. Усяго рэйтынг складаецца з сотні кампазіцый, сярод якіх таксама ўказаны I Can't Help Falling In Love Элвіса Прэслі (11-е месца), Happy Фарэла Уільямса (14-е месца), These Boots Are Made For Walkin' Нэнсі Сінатры (21-е месца), Eye Of The Tiger гурта Survivor (25-е месца) і Lose Yourself рэпера Эмінема (27-е месца). Бясспрэчным лідарам па колькасці топавых кампазіцый стаў гурт The Beatles.

Крымінал

# Сварка скончылася палаючым «Хітом»

**У аператыўна-дзяжурную службу Фрунзенскага РУУС г. Мінска паступіла паведамленне аб тым, што каля 0 гадзін 30 хвілін невядомы здзейсніў падпал крамы «Хіт», размешчанай па вуліцы М. Лынькова.**

Па прыбыцці на месца здарэння аператыўнікі канфіскавалі лічбавыя носьбіты з камер відэаназірання. Пасля вывучэння запісаў былі ўстаноўлены прыкметы адзення меркаванага падазраванага, але якасць малюнка не дазваляла дакладна меркаваць аб знешнасці. Падчас аналізу магчымага маршруту руху зламысніка былі канфіскаваны відэазапісы з найбліжэйшых ад месца ўзгарання аб'ектаў. Пры іх вывучэнні падобны па прыкметах мужчына быў знойдзены і затрыманы па месцы жыхарства.

Па інфармацыі ГУУС Мінгарвыканкама, ім аказаўся 65-гадовы мінчанін, які злоўжывае спіртнымі напоямі. У ноч здзяйснення злачынства ён пасварыўся са сваёй сужыцелькай, якая падзарабляла зборам макулатуры. Мужчына вырашыў пазбавіць яе крыніцы даходаў, узяў бутэльку з растваральнікам і здзейсніў падпал кардону, які жанчына складзіравала каля крамы. Затрыманы растлумачыў, што спаліць сам гандлёвы аб'ект ён не планаваў.

Устаноўлена, што ў 2001 годзе мужчына быў судзімы за ўхіленне ад утрымання дзяцей. Цяпер судзімасць знятая і пагашана.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# БРАНЯТЭХНІКА РЫХТУЕЦЦА ДА ПАРАДА

**Гэтымі днямі на аэрадроме Ліпкі механізаваная калона робіць трэніровачныя прагоны. Яны прымеркаваны да парада войскаў Мінскага гарнізона ў гонар 75-годдзя вызвалення Беларусі, які адбудзецца а 9-й гадзіне вечара 3 ліпеня каля абеліска «Мінск — горад-герой». За тым, як вайскоўцы адточваюць майстэрства раўнамернага ходу ў калоне, паназіралі карэспандэнты «Звязды».**








— У парадзе возьмуць удзел 22 разлікі ваеннай тэхнікі, якія складаюць 280 адзінак. Гэта на 40 болей, чым летась, — паведаміў **намеснік камандуючага войскамі Паўночна-Заходняга аператыўнага камандавання генерал-маёр Уладзімір КУЛАЖЫН**, які кіруе трэніроўкамі механізаванай калоны. — Што да агульнай колькасці асабовага складу, то яна дасягне 900 чалавек. Адметнасцю парада стане тое, што больш як палова парадных разлікаў тэхнікі будзе прадстаўлена мадэрнізаванымі і новымі ўзорамі. Трэніроўкі адбываюцца на працягу пяці тыдняў на аэрадроме Ліпкі.

Адзін з танкаў, якія пройдуць каля абеліска, павядзе **механік-кіроўца Андрэй ЮДЗІН.** Ён служыць з 2014 года ў 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгадзе.

— Трэніроўкі даюцца не вельмі проста. Патрэбна проста жалезная вытрымка. Але ўсё гэта дзеля пачэснай місіі. Мне, як механіку-кіроўцу, пастаўлена задача трымаць аднолькавую хуткасць, раўненне. Мы тут знаходзімся з аўторка па чацвер з сямі гадзін раніцы да шасці вечара. За дзень праводзіцца 8-9 прагонаў тэхнікі. І напередзе — яшчэ два з паловай тыдні рэпетыцый. Пасля кожнага прагону ўдакладняюцца недахопы. Ніякіх адхіленняў не дапускаецца: калона мусіць ісці роўна, а тэхніка — на аднолькавай адлеглгасці.

У складзе аднаго з экіпажаў БТР-80 — **старшы лейтэнант Ігар КОРЗУН.**

— Гэта ў мяне ўжо дзявяты парад. Спачатку атрымаў пяць гадоў досведу ў пешай «каробцы», пакуль быў курсантам Ваеннай акадэміі. Затым два гады маршыраваў, маючы ўжо афіцэрскае званне. І вось ужо другі парад у мяне на тэхніцы. Перайсці было вельмі лёгка. У пешай «каробцы», на мой погляд, складаней. Але і тут таксама ёсць свае асаблівасці: трэба, каб кіроўца адчуваў машыну, вёў яе строга па лініі ў калоне, трымаў раўненне і кантраляваў машыну па прыборах, каб яна не выйшла са строю.

У нас з кіроўцаў палова маладых. Прычым яны паказваюць вельмі высокі ўзровень кіравання, разумеючы тэхніку вельмі добра. Але ўсё гэта не адмяняе таго, што да кожнага з іх патрэбен індывідуальны падыход. Усе кіроўцы, каб не збіцца з хуткасці, выбіраюць для сябе арыенціры.



Трэніроўкі механізаванай калоны праходзяць з аўторка да чацвярга. У панядзелак і пятніцу тэхніка знаходзіцца на абслугоўванні, паколькі яе трэба ўвесь час падтрымліваць у выдатным стане. Падчас праходжання калона расцягнецца на два з паловай кіламетры. Парадная хуткасць яе складзе 14—15 кіламетраў за гадзіну. Для падрыхтоўкі былі адабраны найбольш спрактыкаваныя вайскоўцы. Парад адкрые славуты танк Т-34.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Дзмітрыя СУГАНЯЕВА.**

Сітуацыя

# Абноўка на радасць ці на смутак?

**Ясным сонечным дзяньком я прагульвалася па праспекце і цешылася вясенняй цеплынёй. Настрой быў натхняльны, і я нават не заўважыла, як апынулася ў краме. «Як на вас зроблены!» — падхвальвала прадавачка прыгожыя туфлі на абцасах. Неўзабаве я стала іх шчаслівай уладальніцай.**

Радасці ад абноўкі было — быццам на сто коней села! Чароўныя абцасікі нязменна ўздымалі настрой. Вось і той раніцай доўга я падбірала сукенку — стварала вобраз, завяршыць які павінны былі жаданыя туфлі. Але як абуваць — ой: мой туфель, як кажуць, есці просіць: падэшва адклеена. Як гэта здарылася? Ці можна чакаць такое ад абноўкі? Не ганячы — не купіш, не хвалячы — не прадасі...

— Туфлі расклеіліся з-за механічных пашкоджанняў, па вашай віне, — заявіў гаспадар крамы аднаго з гандлёвых цэнтраў г. Мінска, калі я прынесла назад сваю абноўку.

— Расклеіцца на другі дзень? — дзівілася я.

На маё патрабаванне вярнуць грошы за няякасны тавар гаспадар крамы адказаў адмоўна: туфлі былі ў выкарыстанні, а расклеіліся з-за пашкоджанняў. Я напісала заяву.

Развітацца з чароўнымі абцасікамі было складана, але як выратаваць сітуацыю? Трэба вярнуць грошы. Прызнацца, абутак я купляю часта. І выпадкі, калі няякасны даводзілася здаваць назад, бывалі, але грошы аддавалі адразу. А тут...

Ад званка гаспадара крамы з прапановай зрабіць экспертызу абутку вочы на лоб палезлі. Ён хоча высветліць, па якой прычыне адклеілася падэшва, і настойвае на тым, што я сама вінавата ў адклейцы. Але як такое магчыма, калі з жаданых абцасікаў я пылінкі здзьмухвала... Пра вяртанне грошай за няякасны абутак гаспадар крамы і слухаць



не хацеў: толькі экспертыза, прычым... за мае грошы. Выбачайце! Мала таго, што за туфлі я аддала 50 рублёў, дык яшчэ аплачваць экспертызу, якая каштуе, як высветлілася, больш чым 100 рублёў! Дзе шукаць паратунку?

Калі наступны раз я прыйшла ў гэту краму, гаспадар грымнуў мае чароўныя абцасікі аб зямлю і тым самым дабіў іх канчаткова. «Выклікайце міліцыю!» — схамянуліся спудажаны пакупнікі-відавочцы гандлёвага цэнтра. Такога зыходу справы не чакаў ніхто...

У Законе Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў» пазначана, што спажывец мае права патрабаваць вяртання заплачаных за недабраякасны тавар грошай. І патрабаванне вяртання грошай павінна быць задаволена прадаўцом неадкладна. Калі гэта немагчыма зрабіць адразу, то прадавец павінен вярнуць грошы на працягу 7 каляндарных дзён, а пры неабходнасці правядзення экспертызы — на працягу 14 каляндарных дзён. За парушэнне гэтых тэрмінаў прадавец выплачвае спажыўцу няўстойку ў памеры 1 % ад цаны тавару за кожны дзень пратэрміноўкі. Экспертыза праводзіцца пры ўзнікненні паміж прадаўцом і спажыўцом спрэчкі аб наяўнасці недахопаў і прычынах іх узнікнення. Экспертыза праводзіцца за кошт прадаўца, але, калі ў выніку яе будзе ўстаноўлена, што недахопы тавару адсутнічаюць ці ўзніклі пасля перадачы тавару спажыўцу з прычыны парушэння ім правілаў карыстання, захоўвання, транспарціроўкі, спажывец абавязаны кампенсаваць прадаўцу расходы на правядзенне экспертызы.

Але ў маім выпадку прадавец адмаўляўся рабіць экспертызу за свой кошт, хаця па законе павінен.

У ГА «Беларускае аб'яднанне абароны спажыўцоў» мне патлумачылі, што экспертыза каштуе 118 рублёў, вынік пасля яе даецца не пазней чым праз 10 дзён. Калі экспертыза ўстановіць, што адклейка — вытворчы дэфект, прадавец павінен вярнуць грошы за недабраякасны тавар.

Дык ці магчыма «склеіць» адносіны паміж прадаўцом і пакупніком?

Паважаны гаспадар крамы, чакаю вяртання грошай за няякасны абутак.

**Наталля СВЯТЛОВА.**

Жыллё маё

# ЛЕТАМ ПАДАРАЖЭЕ ГАРАЧАЯ ВАДА

**Субсідзіраваныя тарыфы на цеплазабеспячэнне (ацяпленне і абагрэў вады) падаражэюць з 1 чэрвеня на 1,1 долара — да 18,4831 рубля за 1 Гкал (было 16,9259 рубля). Гэтая лічба, прыплюсаваная да павелічэння «жыровак» 1 студзеня на 3,9 долара (тады падаражэлі выплаты за газ, свет, водазабеспячэнне і водаадвядзенне, капрамонт, санітарнае ўтрыманне), у суме складзе тыя самыя 5 долараў, на якія штогод падрастае «камуналка».**

Як тлумачаць спецыялісты, сёлета тарыфы на паслугі ЖКГ вырашылі падымаць у два этапы, каб падчас ацяпляльнага сезона насельніцтву не даваліся плаціць адразу вялікія сумы. Пасля адключэння батарэй павелічэнне аплаты станецца менш прыкметным для спажывецкага кашалька. Пры гэтым эканамічна абгрунтаваны тарыф на цеплазабеспячэнне ўсё ж падрос 1 студзеня — з 81,42 да 88,99 рубля за 1 Гкал.

**Ірына СІДАРОК.**

Здарэнне

# Запраўляў газонакасілку і падпаліў дом

**Пад вечар ратавальнікам паступіла паведамленне пра тое, што ў вёсцы Высокая Кармянскага раёна гарыць жылы дом. Калі да месца выкліку прыбылі падраздзяленні МНС, будынак быў ахоплены адкрытым полымем. Жыхары ў момант прыезду ратавальнікаў знаходзіліся на вуліцы.**

Па папярэдніх звестках, як паведамілі ў МНС, падчас запраўкі газонакасілкі адбылася ўспышка гаручай вадкасці, ад чаго загарэлася маёмасць на верандзе. У выніку здарэння гаспадар дома атрымаў апёкі. Пасля агляду брыгадай хуткай медыцынскай дапамогі ён быў шпіталізаваны ў раённую бальніцу.

У выніку пажару агнём пашкоджана 40 квадратных метраў даху дома і знішчана маёмасць на верандзе. Прычына здарэння высвятляецца. Версія, якая разглядаецца, — неасцярожнае абыходжанне з агнём.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Міншчына дзівосная

# МІНУЛАЕ ПРОДКАЎ ПРАЗ ПАДАННІ І ЛЕГЕНДЫ



**У што верылі нашы продкі, якім міфічным істотам пакланяліся, якіх шанавалі, а якіх баяліся і лічылі за лепшае з імі не сустракацца? Пра гэта і не толькі раскажа ўнікальная экспазіцыя Заслаўскага музея лесу і міфалогіі.**

— Наш музей адкрыўся ў 2005 годзе і з'яўляецца адзіным не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Ён лічыцца дзіцячым, ды наведваюцца сюды і дарослыя, тыя, хто праз паданні, міфы, вобразы хоча больш ведаць пра мінулае нашых прашчураў, — кажа **супрацоўніца гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Заслаўе» Тамара ГУДЫНА.** — Беларуская міфалогія не такая багатая, як, напрыклад, грэчаская. Тым не менш яна цікавая, шматгранная. І мы імкнуліся паказаць тыя міфічныя вобразы, што жылі побач з нашымі продкамі, а можа, жывуць і цяпер сярод нас. Магчыма, яны назіраюць за намі, падказваюць, як сябе паводзіць у пэўны момант. Але мы іх не бачым і не чуем.



Канцэпцыя музея — паказаць цёмныя і светлыя праявы ляснога жыцця. На светлым баку лесу пасяліліся звяры і птушкі. На цёмным — розныя нячысцікі, прадстаўнікі паралельнага свету.

Самы страшны дух — Балотнік. Ён завабліваў людзей у балота, спакушаючы салодкімі ягадамі, штораслі там. Ступіць чалавек, каб сарваць дары лесу, і гіне ў дрыгве. Балотнік сабраў каля сябе кампанію, ды яшчэ якую — страшных павукоў, ядавітых змей. Усе яны — яго памочнікі ў злых справах.

А побач на дрэве сядзіць Русалка. Жылі гэтыя істоты ў чыстых азёрах або рэках. Гэта патанулыя дзяўчаты — іх душы перасяляліся ў Русалак. Паводле паданняў, у пачатку лета, калі надыходзіць русальны тыдзень, яны маглі моцна злавацца, нервавацца. Некаторыя выходзілі на бераг, іншыя залазілі на дрэва і пелі самотныя песні або вадзілі ў жытнёвых палях карагоды. Інакш вытоптвалі кругі, заманьваючы асоб мужчынскага полу.

На цёлым камені грэецца сям'я вужакаў, а галоўны сярод іх — Цар-вужака. У беларускай міфалогіі ён займае пачэснае месца, лічыцца важнай і мудрай асобай. Цар ведае, куды весці сваю сям'ю на зімоўку, а калі вяртацца назад. Каб пагрэцца, ён выбірае на паляне вялікі цёплы камень. Як лічылі раней, такі вужак або цар ёсць у кожнай чарадзе жывёлін. Гэты самы галоўны вужака быў памочнікам у гаспадара лесу — Лесавіка, або, як яго называюць, Лесуна. Вось ён стаіць такі моцны, з доўгімі валасамі, і чуе за кіламетры, што адбываецца ў яго ўладаннях.



У кожнага Лесавіка была свая тэрыторыя ад аднаго пералеску да другога. І калі ён выходзіў на край лесу, то станавіўся маленькім, непрыкметным. А вось у лясным гушчары быў зноў высокім і дужым, нават мог вырваць дрэва з каранямі і зрабіць з яго посах. Звяры і птушкі былі сябрамі Лесавіка, ён іх апекаваў, а яны верай і праўдай яму служылі. Сава ноччу ўсё ўбачыць і раніцай раскажа, што адбывалася ў лесе, калі гаспадар спаў.

А хто затаіўся ў карчазе? Прыгледзеўшыся, бачыш невялічкага дзядка, які ручкамі-кручкамі моцна трымаецца за корч. Менавіта таму яго часам называюць Карчажнік. Іншыя — лясны гном, Лесавічок, Хапун. Гэтая мілая істота любіць забаўляцца з грыбнікоў. Убачыць, што чалавек ідзе з дарамі лесу ў кошыку, абавязкова непрыкметна падкіне яму пад ногі сук або корч. Грыбнік спатыкнуўся, упаў, а грыбы пасыпаліся на зямлю. Вось табе і харч лясному свавольніку. Калі з дарослымі ў лес прыходзілі дзеці, то яны павінны былі папрасіць: «Лясны дзядок, пакажы мне грыбок», — глядзіш, і пашанцуе на добрае «ціхае паляванне».

Каго з нас у дзяцінстве не палохалі Ваўкалакам або Пярэваратнем? У музеі яго вобраз надта каларытны і страшны. Упершыню пра гэтую істоту пісаў у дахрысціянскія часы старадаўні філосаф і пісьменнік Герадот. Лічылася, што людзі, якія валодалі нядобрым чарадзействам, звярталіся да сіл зла і цемры — Чорнага бога, кабператварыў іх незразумела ў каго, каб іх не пазнавалі суродзічы. І Чарнабог дапамагаў ім стаць страшней за воўка і вышэй за чалавека. Калі людзі нацярпеліся ад гэтага нячысціка, то папрасілі Усявышняга пазбавіць іх ад Пярэваратняў.

— Паданні пасылаюць нам, людзям, сігнал: калі мы будзем рабіць зло адно аднаму, крыўдзіць, то яго назапасіцца столькі, што гэтыя монстры могуць вярнуцца. Мабыць, у кожнай легендзе ёсць напамін, што дабро павінна перамагаць, а зло павінна быць пакарана, — лічыць Тамара Андрэеўна. — Наогул, уся міфалогія нагадвае, што дабро і зло ідуць побач. Але дабра павінна быць больш.

Але, бадай, галоўны герой музея, які прытуліўся каля печы, — добры дух дома — Дамавік. На вуліцу яму лішні раз не хочацца выходзіць, там то халадна, то спякотна, то мароз, то дождж. Таму ён любіць бавіць час у хаце. Дамавіка нашы прашчуры ўяўлялі па-рознаму. Для адных гэта быў дзед невялікага росту з белай барадой і доўгімі валасамі. Для іншых — добры малайчына. Дамавік не любіў, калі ў доме шумелі, смяціלі, крычалі. А яшчэ казалі, што Дамавік не выносіў сварлівых гаспадынь і мог паказдзіць нораў, паказаць, хто ў хаце сапраўдны гаспадар: гаршчок са стравай скінуць з прыпечку або жбан з малаком са стала. І тады жанчына старалася ўласкавіць яго, пакінуць навідавоку нешта смачнае.

Вядома, у музеі пасяліліся далёка не ўсе персанажы беларускай міфалогіі. У сапраўднасці іх значна больш. Але і тая экспазіцыя, што ёсць, прыцягвае да сябе з кожным годам усё больш наведвальнікаў. І гэта знамянальна, бо старажытнае Заслаў'е задумваецца як рэкрэацыйна-турыстычны горад-спадарожнік Мінска.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
**Фота Андрэя САЗОНАВА.**

# СУЧАСНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ — У СЭРЦЫ ПАЛЕСКАГА ЗАПАВЕДНІКА

**На тэрыторыях, пацярпелых ад катастрофы на ЧАЭС, з'явілася сетка для перадачы даных. Праект рэалізавала кампанія velcom | A1, разгарнуўшы першую сетку на тэрыторыі Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка. Базавая станцыя стандарту GSM дапаможа адсочваць экалагічную абстаноўку ў рэгіёне, уключаючы зону адчужэння, а таксама прадухіляць лясныя пажары.**

Палескі дзяржаўны радыяцыйна-экалагічны запаведнік — прыродаахоўны комплекс плошчай 216 тысяч гектараў. Ён часткова ўключае ў сябе тэрыторыю зоны адчужэння, у якую ўваходзяць пацярпелыя ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Хойніцкі, Брагінскі і Нараўлянскі раёны Гомельскай вобласці. Надзейная сувязь — крытычна важны аспект эфектыўнай работы запаведніка. З усталяваннем 70-метровай базавай станцыі і разгортваннем GSM-сеткі на тэрыторыі запаведніка стане магчымы запуск сучаснай сістэмы радыяцыйна-метэаралагічных назіранняў і пажарнага кантролю. Гэта дазволіць атрымліваць аператыўныя звесткі для аналізу абстаноўкі ўнутры ахоўнай зоны.

Рэалізацыя першага ў Беларусі праекта па будаўніцтве базавай станцыі для перадачы даных у зоне адчужэння запатрабавала асаблівага падыходу да ўзгаднення і правядзення ўсіх неабходных работ. Трэба было ўлічваць статус Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка як ахоўнага прыроднага аб'екта, асаблівасці прыроднага ландшафту. Акрамя таго, паколькі запаведнік знаходзіцца ў зоне радыяцыйнага забруджвання, уезд на яго тэрыторыю строга абмежаваны і патрабуе атрымання спецыяльных пропускаў.

Палескі дзяржаўны радыяцыйна-экалагічны запаведнік — найбуйнейшы запаведнік у Беларусі. Ён быў створаны ў 1988 годзе на тэрыторыях, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, з мэтай правядзення радыебіялагічных і экалагічных даследаванняў, а таксама біялагічных назіранняў. Разам з тым запаведнік мае важную ролю ў захаванні біяразнастайнасці палескага рэгіёна: у ім зарэгістраваны 1251 від раслін (у тым ліку 18 занесеных у Чырвоную кнігу), 54 віды млекакормячых, 25 відаў рыб, 280 відаў птушак. Больш за 40 відаў жывёл адносяцца да рэдкіх і знікаючых.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Я зноў выбіраю «Звязду»

# ВУЧЫЎСЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ ПА ГАЗЕЦЕ

**Падчас прэс-канферэнцыі ў Нясвіжы, якая праходзіла ў межах фестывалю «Музы Нясвіжа—2019», маэстра Міхаіл Фінберг, перад тым як адказаць на пытанне карэспандэнта «Звязды», вельмі цёпла выказаўся пра выданне:**


Фота БелТА.

— Перш-наперш дзякуй, што вы знайшлі час і прыехалі ў Нясвіж, каб паслухаць добрых і таленавітых выканаўцаў, акунуцца ў атмасферу нацыянальнага свята музыкі.

Маэстра адначыў, што менавіта па газеце «Звязда» вучыўся разумець родную мову. «Я і цяпер хачу чытаць вершы паэтаў, якія тут друкуюцца, артыкулы аўтараў, што тут працуюць. Але не заўсёды стае часу, — прызнаўся Міхаіл Якаўлевіч. — Дзякуй за тое, што старэйшае ў краіне беларускамоўнае выданне не забылася пасцаць свайго супрацоўніка на фестываль. Гэта вялікая пашана і гонар для ўсяго нашага творчага калектыву. Ваша газета нездарма называецца «Звязда», гэта сапраўдная зорка. І я ніколі не забуду, што «Звязда» першай мяне павіншавала з атрыманнем ганаровага звання Народнага артыста Беларусі».

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**


## «Свежыя навіны ад «Звязды»!»



Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на III квартал або II паўгоддзе 2019 года, запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 16 ліпеня 2019 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Сярод падпісчыкаў 17 ліпеня 2019 года будуць разыграны сем умывальнікаў «Акватэкс» і суперпрыз — душавая кабіна «Акварэль». Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 25 ліпеня.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 30 верасня пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або II паўгоддзе 2019 г. і пашпарта. Пасля 30 верасня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Свежыя навіны ад «Звязды»!» чытайце ў нумары 99 газеты «Звязда» ад 30.05.2019 г.

**Тэлефон для даведак (017) 263 66 73.**
**Тэрмін правядзення гульні — з 01.06.2019 да 30.09.2019.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3563 ад 28.05.2019 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2019 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ______________________

______________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ______________________
(аддзяленне сувязі)

______________________ **на III квартал або II паўгоддзе 2019 года**

**Хатні адрас і тэлефон** (абавязкова) [ ] (індэкс) ______

______________________

______________________

Удачы ў розыгрышы!

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Универмаг «Солигорск» (продавец), проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:

**здание склада с инв. № 644/С-3267 общей площадью 846,6 кв. м и ограждение железобетонное с инв. № по бух. учету 2Б, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 625000000012000035 площадью 0,1888 га по адресу: Минская область, Солигорский район, район станции «Калий – 1».**

Начальная цена объекта с НДС (20 %) **– 104 520,00 бел. руб.** Задаток 10 % от начальной цены (**10 452,00 бел. руб.).**

**Установлены типовые условия продажи объекта:**

- в случае отсутствия необходимости изготовления проектно-сметной документации:

в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на Объект проинформировать Солигорский районный исполнительный комитет об отсутствии необходимости получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ;

обеспечить безопасность и ограничение доступа на Объект с момента подписания акта о приеме-передаче;

навести на земельном участке, отведенном для обслуживания Объекта, порядок в течение одного месяца с момента подписания сторонами акта о приеме-передаче;

привести Объект в надлежащее санитарное, техническое состояние в течение двенадцати месяцев с момента подписания акта о приеме-передаче;

- в случае необходимости проведения работы, требующей изготовления проектно-сметной документации (проектирование, возведение, реконструкция, реставрация, капитальный ремонт, благоустройство либо снос):

обратиться в Солигорский районный исполнительный комитет для получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ не позднее шести месяцев с даты государственной регистрации перехода права собственности на Объект;

начать разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ в течение одного месяца с даты получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ;

осуществить реконструкцию (строительство), реставрацию, капитальный ремонт, благоустройство либо снос Объекта в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, если иное не установлено решением Солигорского районного исполнительного комитета;

обеспечить безопасность и ограничение доступа на Объект с момента подписания акта о приеме-передаче;

- использовать земельный участок в соответствии с действующим законодательством;

- поддерживать надлежащее санитарное, техническое состояние Объекта и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) Объекта до его сноса (гибели);

- запрет на отчуждение Объекта до выполнения Покупателем условий договора купли-продажи (за исключением случаев отчуждения, передачи без перехода права собственности объекта Покупателем, являющимся физическим лицом, созданному им субъекту хозяйствования, либо использования объекта при регистрации физического лица в качестве индивидуального предпринимателя);

- по требованию Продавца представлять письменную информацию о выполнении обязательств и условий договора купли-продажи (с подтверждающими документами, фотоматериалами), а также возможность обследования Продавцом Объекта для проверки представленной информации.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере: 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 30.03.2019.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **17.06.2019** в **15.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.06.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

---

Экономическим судом г. Минска вынесено определение от 30.04.2019 о рассмотрении вопроса о защите требований ООО «СК Ратомка» на собрании кредиторов по делу в отношении ООО «Белхартэх» (УНП 190496731). Собрание кредиторов состоится 11.06.2019 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. З. Бядули, д. 11, оф. 809. Ознакомиться с предъявленными требованиями можно по указанному адресу, тел. 80297627059.

---

## Извещение о проведении открытых аукционов по продаже земельных участков в частную собственность

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 24-63-14.

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| **Лот № 1.** Земельный участок с кадастровым № 220888126601000494 площадью 0,1327 га по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Слободковский с/с, аг. Слободка (участок № 11) для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранные зоны особо охраняемых природных территорий (Национальный парк «Браславские озера»), водоохранная зона рек, водоемов (озеро Недрово, озеро Потех, озеро Неспиш, озеро № 12, река Друйка). **Начальная цена:** 6000,00 бел. руб. Размер задатка: 600,00 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY40AKBB36003120800000000000, г. Минск ОАО «АСБ Беларусбанк» IBAN AKBBBY2X, УНП 300594330 (Слободковский сельсовет) |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 09.07.2019 в 12.00 по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, г. Браслав, ул. Советская, 119, в Браславском районном исполнительном комитете. **Срок внесения задатков и приема документов:** с 03.06.2019 с 8.30 по 08.07.2019 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни. **Условия аукциона:** обратиться в течение двух месяцев со дня утверждения протокола аукциона за государственной регистрацией прав на зем. участок в Браславское бюро Полоцкого филиала РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; разработать и утвердить в установленном порядке проектно-сметную документацию на строительство объекта в срок, не превышающий 2 (два) года; произвести занятие (освоение) зем. участка не позднее 1 (одного) года со дня утверждения проектной документации на строительство жилого дома; до начала строительства снять плодородный слой почвы в местах размещения строений и сооружений и использовать его в соответствии с проектной документацией |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, начальная цена |
|---|
| Лот № 1. Земельный участок с кадастровым № 221280610601000207 площадью 0,1452 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Бабиничский с/с, д. Подберезье, ул. Новоселов, 10, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (р. Западная Двина), охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 В. **Нач. цена:** 2 000,00 бел. руб. **Задаток:** 200,00 бел. руб. |
| Лот № 2. Земельный участок с кадастровым № 221280603601000080 площадью 0,1494 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Бабиничский с/с, п.Витьба, ул. Дальняя, 13, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. Нач. цена: 2 000,00 бел. руб. Задаток: 200,00 бел. руб. |
| Лот № 3. Земельный участок с кадастровым № 221280603601000081 площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Бабиничский с/с, п. Витьба, ул. Дальняя, 19 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 В. Нач. цена: 2 000,00 бел. руб. Задаток: 200,00 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 02.07.2019 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 03.06.2019 с 8.30 по 01.07.2019 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY23AKBB36003140100360000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа – 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Бабиничский с/с). **Условия аукциона:** в двухмесячный срок со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обратиться в РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в установленном порядке за гос. регистрацией права на зем. участок, ограничений (обременений) права на земельный участок; получить в установленном порядке разрешение Витебского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; в течение 1 года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем. участка в соответствии с целью и условиями его предоставления; осуществить строительство объекта (одноквартирного жилого дома) в сроки, определенные ПСД; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД |

Аукционы проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь, консолидированные участники (двое и более граждан Республики Беларусь). Для участия в аукционе граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

---

### РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже зданий и сооружений производственно-административного комплекса, принадлежащих ОАО «БЕЛСЕЛЬЭЛЕКТРОСЕТЬСТРОЙ»

Лот № 1. 1. АБК с инв. № 602/С-22102, 1995 г. п. Площадь – 606 кв. м. 2. Производственный корпус с инв. № 602/С-22103. Площадь – 1783,9 кв. м. 3. ЦТП с насосной с инв. № 602/С-22105, 1995 г. п. Площадь – 34 кв. м. 4. Повышенный путь с инв. № 602/С-49006. Протяженность – 105,3 м. 5. Склад готовых изделий с инв. № 602/С-22107. Площадь застройки – 4214 кв. м. 6. Кран мостовой с инв. № 264 7. Кран мостовой, инв. № 179; 8. Кран мостовой, инв. № 178. 9. Кран мостовой, 10с-16.5-12-УЗ, инв. № б/н.
Адрес: Минская обл., Пуховичский р-н, Свислочский поселковый Совет, п. Дружный, промплощадка ТЭЦ-5.
Земельный участок: кадастровый номер 624400000001004035, площадь 2,8361 га. Право постоянного пользования. Список обременений на земельный участок на сайте Организатора аукциона ino.by.
Начальная цена с НДС – 773 940,84 бел. руб. Задаток – 70 000,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.
Условия аукциона: 1. Подписать с Продавцом договор купли-продажи в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. 2. Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при подписании договора купли-продажи. 3. Оплатить Организатору аукциона вознаграждение в размере 1,5 % от цены продажи Лота в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона

Аукцион состоится 08.07.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Продавец: ОАО «БЕЛСЕЛЬЭЛЕКТРОСЕТЬСТРОЙ», г. Минск, ул. Сухая, д. 3, тел. 8 (017) 226-66-47. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 4. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 08.07.2019 (ОАО «БЕЛСЕЛЬЭЛЕКТРОСЕТЬСТРОЙ», лот № 1). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 04.07.2019 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта – Халецкий Сергей Александрович, тел. 8 (017) 752-80-32.

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 www.ino.by e-mail: torgi@ino.by**

---

В суд Кобринского района поступило заявление об объявлении умершим Сахарука Вениамина Ефремовича, 29 марта 1968 года рождения. Последнее известное место жительства – д. Колодищи Минского района Минской области.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, располагающим какими-либо сведениями о Сахаруке Вениамине Ефремовиче, сообщить суду Кобринского района Брестской области в течение двух месяцев со дня публикации.

---

### РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже торгово-складской базы, принадлежащей ОАО «МИНСККОНТРАКТ» (Продавец)

Лот № 1. Торгово-складская база: 1. Магазин с инв. № 610/С-43874, 1973 г. п. Площадь 618,2 кв. м. 2. Здание склада с инв. № 610/С-43843, 1985 г. п. Площадь 876 кв. м. 3. Здание гаража с инв. № 610/С-43844, 1973 г. п. Площадь 80,3 кв. м. Адрес: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Демина, д. 2А, 2А/1, 2а/3. Обременения: аренда. Части здания склада с инв. № 610/С-43843 сданы по договорам аренды: – 198,00 кв. м. по 31.01.2022; – 138,5 кв. м по 31.01.2022. Земельный участок: площадь 0,3442 га, кадастровый номер 640400000014000250. Право постоянного пользования.
Начальная цена с НДС – 423 738,00 бел. руб. Задаток – 45 000,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.
Аукцион состоится 20.06.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 20.06.2019 (лот № 1, ОАО «МИНСККОНТРАКТ»). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 18.06.2019 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта – Бутвиловский Валерий Дмитриевич, тел.: 8 (017) 7-73-31-41, 8 (029) 308 08 20. Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 23.03.2019

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 www.ino.by e-mail: torgi@ino.by**

# «ВАШЫ ФЭЙКІ — У НАШЫХ РУКАХ»

## АПАКАЛІПСІС СЁННЯ!

Трэба заўважыць, што асновы медыяадукацыі ўжо не першы год укараняюцца ў рамках розных вучэбных прадметаў у беларускіх школах, а прынятая сёлета на дзяржаўным узроўні Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі пацвердзіла актуальнасць той работы, што разгарнулі педагогі. Але ці ёсць у іх намаганняў плён? Гэта вырашыла праверыць Таварыства беларускай школы і абвясціла сярод падлеткаў ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў конкурс «Лаві фэйк!» Прадстаўнікам пакалення, якое ўжо нарадзілася з пальцам на клавішы Enter, прапанавалі паспрабаваць свае сілы ў ролі медыяэкспертаў і выказаць меркаванне на тэму «Быць медыяадукаваным — гэта проста!»: расказаць аб праблеме, з якой сутыкаюцца сябры, аднакласнікі, настаўнікі, бацькі, суседзі, калі глядзяць тэлепраграмы, фільмы, серыялы, чытаюць вэб-сайты ці «сядзяць» у сацыяльных сетках, і прапанаваць свой спосаб іх вырашэння. Творчасць ніхто не абмяжоўваў: конкурснай работай маглі быць мультымедыя (аўдыя ці відэа, кліп, міні-фільм, анімацыя, навучальны відэаролік, падкаст), графічныя і інтэрактыўныя медыя (інфаграфіка, фотарэпартаж, плакат, комікс, гульня, квіз, суполка або старонка ў сацыяльнай сетцы) ці тэкставыя медыя (лонгрыд, блог, пост, артыкул у школьнай прэсе, журналісцкае расследаванне, рэпартаж і іншыя).

**Многія не задумваюцца, што да інфармацыі, як і да ежы, якую мы спажываем, трэба ставіцца вельмі сур'ёзна. Мы ж не кідаем у рот абы-што, а сочым за якасцю прадуктаў.**

Арганізатары конкурсу прызнаюцца: у іх была апаска, што конкурс правaліцца. Або дзеці яго ўвогуле праігнаруюць (ці мала ў старшакласнікаў іншых клопатаў?), або не хопіць кампетэнцый, і якасць работ акажацца недастаткова высокай. Але ўсе былі прыемна ўражаны і нават азадачаны: адкрыць некаторыя конкурсныя работы і ацаніць іх змаглі толькі самыя маладыя з членаў журы — тыя, што таксама нарадзіліся «з пальцам на кнопцы». Чаго вартая толькі гульня-платформер «Вандроўка бульбяша», створаная **Паўлам КАРНЕЕВЫМ з сярэдняй школы № 2 горада Дуброўна.** Трапіць да фінішу можна, толькі адказаўшы на пытанні з гісторыі, геаграфіі, літаратуры, геральдыкі і культуры Беларусі. Тым, хто перадолее ўсе перашкоды, ужо ніякія фэйкі на страшныя.

А пераможцы гэтага конкурсу былі абвешчаны на Фестывалі медыяадукацыі ў сталічным стартаn-хабе «Імагуру», дзе сабраліся малыя і вялікія медыязоркі (члены прафесійнага журы), а таксама педагогі — выпускнікі чаргoвага дыстанцыйнага курса «Медыяадукацыя ў школе».

З 59 праектаў у фінальную частку конкурсу выйшлі 32. Іх аўтары былі запрошаны на свята разам са сваімі педагогамі. У конкурсантаў было 90 секундаў, каб у максімальна сціслай і яркай форме расказаць пра сваю ідэю прысутным і завалодаць іх увагай. Сапраўднае выпрабаванне, з якім падлеткі бліскуча справіліся.

Так, **васьмікласнік Варапаеўскай сярэдняй школы Пастаўскага раёна Іван ЗАРУБА** прадставіў свой кароткаметражны фільм «Канец свету!»

— Усіх вітаю, а паспрабуйце адказаць на пытанне: якія праблемы застаюцца вечнымі? — запытаўся хлопец у аўдыторыі. — Выдзелім з іх толькі дзве: як сустрэць Апакаліпсіс і як вырашыць спрадвечную праблему бацькоў і дзяцей? За дзве тысячы гадоў было ўжо сама меней сем «канцоў свету». І праблемы бацькоў і дзяцей за дзве тысячы гадоў таксама нікуды не зніклі...

Вось што вы будзеце рабіць, калі даведаецеся з інтэрнэту, што сёння ў 19.00 канец свету? Пабяжыце ў краму запасацца «дашыракам», сухарамі і вадой? Схаваецеся ў склеп? Перастанеце звяртаць увагу на звычайныя сацыяльныя абмежаванні і нормы? Пра гэта фільм юнага рэжысёра. Іван Заруба выступіў у ім таксама ў якасці аператара і займаўся мантажом. Яго родны брат зняўся ў галоўнай ролі, а маці была сцэнарыстам.

Хлопец, дарэчы, у выніку перамог у намінацыі «Мультымедыя». **Тэатральны рэжысёр і рэжысёр дакументальных фільмаў Валерый МАЗЫНСКІ,** віншуючы юнага «калегу» з перамогай, канстатаваў: «Ты зрабіў кіно! Задумаў і, галоўнае, давёў справу да канца! Нават калі робіш фільм на 30 хвілін, то прыкладна разоў сто хочаш усё кінуць і разоў пяцьдзясят кідаеш... А ты рызыкнуў замахнуцца на канец свету! Гэта вельмі складана: прыдумаць ідэю, арганізаваць вакол сябе людзей, каб яе рэалізаваць. Але ў цябе ўсё атрымалася...»



Стваральнікі групы «Вашы фэйкі ў нашых руках» — навучэнцы аршанскай 20-й сярэдняй школы: «Мы самі вучыліся, што такое фэйкі, як іх лавіць і што з імі рабіць».



Фота Веры МАЦКЕВІЧ.

Валерый МАЗЫНСКІ Івану ЗАРУБУ: «Ты рызыкнуў замахнуцца на канец свету...»

## БОЛЬШАЯ ПАЛОВА ЦІ МЕНШАЯ?

У намінацыі «Тэкставыя медыя» галоўны прыз дастаўся аўтару артыкула-даследавання «Матэматыка супраць інфармацыйных «качак» **Максіму ЮДЗЯНКОВУ з Усходаўскай сярэдняй школы Магілёўскага раёна** (кіраўнік — настаўніца матэматыкі Алена Міхайлава). «Мне 15 гадоў, я вучуся ў матэматычным класе самай звычайнай вясковай школы, — расказвае хлопец сам пра сябе. — Больш за год «паляваў» у інтэрнэце на інфармацыйных «качак», пералапаціў некалькі сотняў паведамленняў, пераправяраў, параўноўваў, вылічваў і атрымаў ад такой працы вялікае задавальненне. Так у мяне з'явілася свая скарбонка «качак» з інтэрнэт-паведамленняў. З вынікамі маёй працы я выступаў на школьнай канферэнцыі, а таксама перад настаўнікамі матэматыкі Магілёўскай вобласці і іх вучнямі. Лічу, што зрабіў вельмі карысную справу. Мае сябры прызналіся, што пачалі перапраўляць лічбавыя звесткі ў інтэрнэце. Я прывіў ім здаровы скептыцызм. Дарэчы, праверыў свой тэкст на text.ru. Вынік — 95 % унікальнасці».

Шчыра кажучы, прыклады, якія прыводзіць Максім, трэба выкладаць студэнтам яшчэ на журфаку, каб не распаўсюджваць інфармацыйныя «качкі» далей.

— Сярод тэкстаў розных відаў і жанраў (навін, інфармацыйна-аналітычных артыкулаў, паведамленняў і дакладаў), размешчаных у інтэрнэце і прааналізаваных у ходзе даследавання, даволі часта сустракаецца **словазлучэнне «большая палова»,** — кажа Максім. — Пасля пошукавага запыту інтэрнэт выдаў мне прыкладна 28 800 000 вынікаў! Вось некаторыя з іх: «большая палова ўдзельнікаў апытання... лічаць сябе вернікамі»; «большая палова брытанскіх дзяцей хоча працаваць у відэасферы»; «вось і прайшла большая палова паста», «большая палова рэтра-аўтамабіляў у спраўным стане»...

Абапіраючыся на матэматычнае вызначэнне паловы, робім выснову, што палова не можа быць большай ці меншай, яна роўная другой палове цэлага. У выпадках параўнання частак цэлага аўтарам медыятэксту мэтазгодней выкарыстоўваць словазлучэнні «большая частка» ці «меншая частка».

У выніку даследавання высветлілася таксама, што яшчэ адной моўнай канструкцыяй, якая вельмі часта выкарыстоўваецца, з'яўляецца **фраза «на парадак больш».** З яе дапамогай аўтары артыкулаў імкнуцца падкрэсліць істотную розніцу паміж велічынямі, якія яны параўноўваюць: «у цэлым з-за правільнага харчавання працягласць жыцця дыябетыкаў на парадак вышэйшая, чым у здаровых людзей». Сярэдняя працягласць жыцця ў Расіі ў 2013 годзе (год выхаду артыкула) складала 70,58 года. Па сцвярджэнні аўтара, працягласць жыцця дыябетыкаў на парадак большая, значыць, складае як мінімум 100 гадоў. Гэта супярэчыць не толькі матэматыцы, але і здароваму сэнсу. «На парадак» азначае ў дзесяць разоў.

А сцвярджэнні такога кшталту, як «інтэлект сабакі на парадак вышэйшы за каціны», «якасць паслуг на парадак вышэйшая» ці «ўзровень жыцця на парадак вышэйшы», з пункту гледжання матэматыкі наогул пазбаўлены сэнсу. У выніку даследавання прыходзім да высновы — папулярная сярод журналістаў фраза «на парадак больш» не нясе канкрэтнай інфармацыі пра змяненне велічыні.

Максім раіць аўтарам замест такога неканкрэтнага параўнання карыстацца тэрмінам адноснасці (удвая больш, утрая, у сем разоў) або карыстацца працэнтамі: на 150 % больш (гэта азначае ў два з паловай разы). Тут змяненні цалкам зразумелыя і не супярэчаць законам матэматыкі, сцвярджае юнак.

## «ХАЛОДНАЯ ЗБРОЯ» НА ВАЙНЕ

Сапраўднае паляванне на фэйкі арганізавалі **навучэнцы сярэдняй школы № 20 з Оршы,** стварыўшы ў сацыяльнай сетцы «УКантакце» групу «Вашы фэйкі ў нашых руках». Іх банк увесь час папаўняецца новымі прыкладамі — хітрыкамі маркетолагаў, рэкламадаўцаў, лістамі і рассылкамі па электроннай пошце, якія ўтрымліваюць мноства прывабных прапаноў, памылкамі, знойдзенымі ў вучэбных дапаможніках і так званых «рашэбніках».

**Шасцікласніцы Хрысціна ХАРЛАНАВА і Дар'я БАГДАНОВІЧ**

### Даведка

Фэйк — слэнгавы тэрмін, які азначае падробку, копію або фальсіфікацыю. У дачыненні да сродкаў масавай інфармацыі пад фэйкам разумеюць навіну, якая не мае нічога агульнага з праўдай, так бы мовіць, падробку навіны. Фэйкі могуць красці за жывое тых, хто іх чытае. У гэтым выпадку ў чалавека адключаецца логіка, уключаюцца эмоцыі і ён верыць у самую неверагодную інфармацыю.

раяць не спісваць дамашнія заданні з рэсурсу ГДЗ. Па-першае, там шмат памылак, а па-другое, нумары заданняў могуць не супадаць. «Падобна на тое, што людзі зарабляюць на нашай ляноце і нежаданні вучыцца, — папярэджваюць яны. — Калі што, лепш у аднакласнікаў за піражок спісаць, а ідэальны варыянт — самім мазгамі паварушыць! Выснова — вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца!!!» У сваёй групе дзяўчаты размясцілі скрыншоты рэальных дамашніх заданняў і іх фэйкавых гатовых рашэнняў.

«Многія думаюць, што фэйк — гэта выключна падроблены акаўнт, махлярства ці няпраўдзівая інфармацыя ў СМІ. Аднак фэйкавымі могуць быць і дзеянні. Асобным відам псіхалагічнай зброі фэйк становіцца на вайне, — даведваемся мы з суполкі ў сацыяльнай сетцы. — Яскравы прыклад такога фэйка можна знайсці ў аповесці Васіля Быкава «У тумане». Галоўны герой твора Сушчэня, трапляючы ў палон да фашыстаў, не пагаджаецца з імі супрацоўнічаць, і за гэта яго страшэнна караюць: адпускаюць дахаты. У выніку гэтага фэйкавага дзеяння жыццё героя становіцца невыносным, і вось ён ужо зайздросціць сваім павешаным сябрам, бо яны загінулі героямі, а да яго, сумленнага чалавека, усе, нават самыя блізкія, ставяцца як да здрадніка. Гэта толькі адзін прыклад выкарыстання фэйка як халоднай зброі на вайне».

**Настаўніца беларускай мовы і літаратуры з 20-й школы Алена ПАНКРАТАВА,** якая курыруе падлеткаў, канстатуе: «Галоўная адметнасць нашага праекта ў тым, што падчас рэалізацыі ідэі мы самі вучыліся. Калі астатнія ведалі, што яны хочуць сказаць, мы стварылі суполку і разам вучыліся таму, а што ж такое фэйкі. Як іх лавіць і што з імі рабіць? Дзеці самі здымаюць відэаролікі, пішуць тэксты, робяць відэападборкі...Барацьбіты з фэйкамі **Глеб АНІСІМАЎ, Кірыл САЛАМЕННІКАЎ, Ілья КАТАШОЎ, Марыя АЛЬШЭЎСКАЯ і Кацярына БАРАНОЎСКАЯ** атрымалі на конкурсе перамогу ў намінацыі «Графічныя і інтэрактыўныя медыя».

Яркім упрыгажэннем медыяфэсту стала гульня «На злом галавы», прысвечаная медыя: утвораныя выпадковым метадам каманды з настаўнікаў і вучняў вучыліся разам на фэсце ў фармаце мазгабойні. «Хітом» стала пытанне, на якое ніхто з прысутных не змог даць правільны адказ: «Колькі пар макавых зёрнаў узяў з сабой на каўчэг Майсей?»

**Настаўнікі з гродзенскай сярэдняй школы № 26 Таццяна і Сяргей ФАДЗІНЫ** (Таццяна выкладае англійскую мову, а Сяргей — фізіку) прэзэнтавалі падчас фестывалю аўтарскі дыстанцыйны курс для падлеткаў «Бачу. Чую. Разумею», які яны плануюць запусціць у новым навучальным годзе. Ці ведаеце вы, адкуль узялося слова «спам»? А на якое паняцце брытанскія ўлады пастанавілі замяніць у афіцыйных дакументах тэрмін «fake news»? Што такое клікбэйт? А ў якой сацыяльнай сетцы больш за ўсё ботаў — акаўнтаў, якія кіруюцца праграмамі, арыентаванымі на маніпуляцыі і змяненне грамадскай думкі? Магчыма, нам усім разам з падлеткамі трэба запісацца на іх курсы?

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Друкуецца ў «ЛіМе»

# АБ'ЯДНАННЕ, ЯКОГА НЕ БЫЛО. АФІЦЫЙНА

## Хто ўваходзіў у літаратурную багему пачатку 1930-х гадоў

**На пачатку 1930-х у краіне віравала літаратурнае жыццё: выходзілі часопісы «Маладняк», «Узвышша» і «Полымя». Існаваў і Дом пісьменніка, а насупраць яго размяшчалася Беларускае дзяржаўнае выдавецтва. Там жа — рэдакцыі часопісаў, газет і бухгалтэрыя, у якой пісьменнікі атрымлівалі ганарары. Пасля ішлі адзначаць падзею ў сталоўку, якая месцілася ў падвале Дома пісьменніка. Там, мусіць, і з'явіўся ТАВІЗ.**

У межах праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця» Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры прапанаваў лекцыю, якую падрыхтаваў даследчык, літаратуразнаўца, супрацоўнік Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва Віктар Жыбуль. Першае, што адзначыў дакладчык, гэта тое, што ў энцыклапедыях няма інфармацыі пра Таварыства аматараў выпіць і закусіць (менавіта так расшыфроўваецца абрэвіятура), бо суполка была нефармальная, стварылася як багемны супраціў беларускаму літаратурнаму афіцыёзу. Існавала нават версія, што нічога насамрэч і не было, усё — містыфікацыя. Але ў часопісе «Роднае слова» за 1997 год выйшаў артыкул Лявона Юрэвіча пад назвай «ТАВІЗаўцы: пра лёсы ўдзельнікаў аднаго літаратурнага аб'яднання». Сутнасць яго ў тым, што ў архіве паэта-эмігранта Юркі Віцьбіча даследчык натрапіў на іх лісты да крытыка Антона Адамовіча з аповедам пра суполку. Праўда, у існаванне ТАВІЗу паэт не паверыў, нягледзячы на тое што сам і напісаў пра яго інфармацыю. Бо падобных звестак нідзе больш не сустракалася...

Але пошукі не спыняліся. Штосьці адкрывалася і выпадкова. Так, сведчаннем існавання ТАВІЗу служыць дакумент той эпохі: нататка, надрукаваная ў «Савецкай Беларусі» за 1 лютага 1931 года за подпісам Б. Б. Падхоплены хваляй барацьбы з «багемшчынай» і «нацдэмаўшчынай», у загалоўку аўтар сцвярджаў: «Арганізатарам багемы не месца ў радах пралетарскіх пісьменнікаў!» Далей паведамлялася, што «...група багемствуючых пісьменнікаў знайшла сабе прытулак у Доме пісьменнікаў і адчувала сябе там як дома... Усе прыгоды гэтай групы набываюць арганізаваны ўжо характар і вырастаюць у групу пад назвай ТАВІЗ... Найбольш сумным з'яўляецца тое, што на чале ТАВІЗу знаходзяцца такія пісьменнікі, як Звонак, Хадыка і Маракоў»...



Фота з архіва Беларускага інстытута навукі і мастацтва (Нью-Ёрк, ЗША).

Валерый МАРАКОЎ у «Шашлычнай» на вуліцы Камсамольскай. Мінск, 1930-я гады.

Як пісаў ва ўспамінах пра суполку Юрка Віцьбіч (ён і сам быў яе ўдзельнікам), ТАВІЗаўцамі з'яўляліся Міхась Багун, Тодар Кляшторны, Сяргей Дарожны і шмат іншых. Яны ўяўлялі з сябе дэманстрацыйную ў дачыненні да Саюза пісьменнікаў БССР забароненую багему.

Віцьбіч падкрэсліваў, што не ў залах і кабінетах Дома пісьменнікаў, а ў шынках па Савецкай і Камсамольскай сталічных вуліцах абмяркоўвалі таленавітыя ТАВІЗаўцы сваю творчасць — пасяджэнні зазвычай праводзіліся ў кавярнях, піўнушцы, шашлычнай, у гасцініцы альбо на кватэры. Былі нават сустрэчы на закрытым ад цікаўных вачэй балконе рэстарана «Еўропа».

У самой назве ТАВІЗ адчуваўся і эпатаж, і пародыя на тагачасныя афіцыёзныя ўстановы, што імкнуліся прыдумаць нейкую абрэвіятуру. Было і імкненне схаваць крамольную літаратурную дзейнасць, бо на сходах чыталіся не вершы, прызначаныя для друку, а тыя, што пісаліся для сябе, — кожны ў іх пачуваўся сам сабой. Пісьменнікі і камуфлявалі сваю суполку пад зборышча алкаголікаў таму, што так было прасцей і бяспечней. Калі паэта застуквалі за напісаннем контррэвалюцыйных вершаў, справа магла скончыцца значна больш трагічна, чым калі яго затрымлівалі ў нецвярозым выглядзе. Тады, у 1930-х, пракацілася хваля рэпрэсій па справе Саюза вызвалення Беларусі... З іншага боку, чым бліжэй было да сярэдзіны 1930-х, тым больш у грамадстве адчувалася напружанне, у друку часта з'яўляліся артыкулы адыёзных крытыкаў з палітычнымі абвінавачаннямі. Таму нядзіўна, што ў паэтаў былі трагічныя прадчуванні — яны імкнуліся ўхапіць апошнюю магчымасць зведаць радасць у выглядзе сяброўскага застолля перад тым, што іх чакала наперадзе. Міхася Багуна, аднаго з яркіх лідараў, і называе Юрка Віцьбіч вынаходнікам назвы суполкі. Пісьменнікі тады мусілі весці падвойнае жыццё. Так, яны друкавалі ў газетах і часопісах вершы, у якіх услаўлялі курс партыі і тагачасных правадыроў. Аднак Віцьбіч згадвае, што паэты мелі ў запасніках і вершы на смерць партыйных правадыроў і, калі гэтая падзея здаралася, упісвалі прозвішчы ў гатовы верш і беглі ў рэдакцыю.

Падвойнае жыццё ТАВІЗаўцаў выяўлялася яшчэ і ў тым, што яны займаліся калектыўнай творчасцю для дзяцей. У часопісах за 1934—1935 гады можна пабачыць вершы, якія пісалі разам Тодар Кляшторны і Алесь Дудар. Трохі пазней да іх далучыўся і Валерый Маракоў. Уважлівае чытанне твораў для дзяцей наводзіць на роздум: а хто маецца на ўвазе ў галоўных вобразах? Магчыма, творцы адлюстравалі ўласныя перажыванні, трывожныя прадчуванні. Тыя ж трывожныя вобразы сустракаліся і ў дарослай творчасці ТАВІЗаўца Тодара Кляшторнага.

Сярод успамінаў Юркі Віцьбіча ёсць згадкі пра той час, калі прымалася сталінская канстытуцыя: паўсюль у дзяржаўных установах ішло актыўнае абмеркаванне падзеі, а чыноўнікі ад літаратуры адзначалі яе гарачымі прамовамі. Тады ж у сталоўцы Дома пісьменніка за куфлем горкага піва сядзелі Алесь Дудар, Валерый Маракоў і Уладзімір Хадыка. Да іх падышоў Купала і зачытаў урывак паэмы «Над ракою Арэсай», прысвечанай калектывізацыі і індустрыялізацыі. І спытаў: «Ну як вам, хлопцы?» Тыя ў адказ прамаўчалі. Купала зразумеў іх маўчанне, сказаў: «Так, і я з вамі згодны, а вось ім там спадабалася...» Пасля Купала зачытаў на памяць верш Алеся Дудара — той быў настолькі крануты, што заплакаў.

У Віцьбіча ёсць дзіўны сказ: ТАВІЗ праіснаваў да самай вайны. Але такога быць не магло, упэўнены Віктар Жыбуль, бо ў 1937 годзе многія ўдзельнікі таварыства былі арыштаваныя, расстраляныя альбо адпраўленыя ў лагер. Толькі Эдуард Самуйлёнак памёр у 1939 годзе не ў турме — ад сухотаў. Дзеячаў, з якіх мог складацца ТАВІЗ, ужо не было, перакананы даследчык.

Тым не менш хто ведае, што яшчэ хаваюць архівы?..

**Яна БУДОВІЧ.**

Выстаўка

# Вяртанне дадому

**У музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры ў аўторак, 4 чэрвеня, адкрываецца выстаўка «Пётр Шумаў. Вяртанне дадому» вядомага фатографа мінулага стагоддзя, ураджэнца Беларусі Пятра Шумава.**

Лёс многіх таленавітых ураджэнцаў нашай краіны звязаны з вымушанай эміграцыяй. Так склалася і жыццё ўраджэнца Гродна Пятра Шумава, аднаго з самых знакамітых фатографаў Еўропы першай трэці XX стагоддзя, асабістага фатографа Агюста Радэна.

На выстаўцы будуць прадстаўлены копіі 33 фотаздымкаў, зробленых Шумавым, якія атрыманы з парыжскага фонду Parisienne de Photographie — Roger-Viollet.

У 20-я гады мінулага стагоддзя Пётр Шумаў фатаграфаваў выдатных мастакоў, кампазітараў, пісьменнікаў, палітыкаў. Сярод прадстаўленых на фотавыстаўцы работ напэўна ведвальнікі змогуць убачыць партрэты Марка Шагала, Льва Бакста, Уладзіміра Маякоўскага, Марыны Цвятаевай, Альберта Эйнштэйна, Клода Манэ і іншых.

Выстаўка арганізавана пры падтрымцы Пасольства Рэспублікі Беларусь у Французскай Рэспубліцы, былога пасла Беларусі ў Францыі, генеральнага дырэктара Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Паўла Латушкі, журналіста і фотамастака Аляксандра Ласмінскага і Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея.

Вернісаж

# НЕПАПРАЎНЫ РАМАНТЫК ЛАНДАРСКІ

**Тры карціны заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь Роберта Ландарскага папоўнілі фонды палаца Румянцавых і Паскевічаў. Пры закрыцці сваёй выстаўкі «Песня жаўрука» 83-гадовы мастак перадаў музею палотны «Палеская Мадонна», «Час сенакосны» і «Валатава».**

Дарэчы, работы Роберта Ландарскага ёсць у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, музеі сучаснага мастацтва ў Мінску, у прыватных галерэях ЗША, Францыі. Яго карціны маюць многія вядомыя расійскія і ўкраінскія музеі — як абласныя, так і сталічныя. Але ж не гэта з'яўляецца яго гонарам. Ён усё жыццё піша Беларусь. Можна сказаць, пэндзлем спявае пра яе разнастайны лёс — лірычны, трагічны, узнёслы, самотны... Як чалавек, улюбёны ў сваю зямлю, з ёй разам праходзіць шляхамі і сцяжынкамі, успамінае мінуўшчыну і занатоўвае сучаснасць.

Яго карціны здзіўляюць сакавітасцю фарбаў, жыццярадасным настроем і шчырай



любоўю. Героямі робяцца сябры, суседзі, сваякі... І ў першую чаргу — жонка і сын. Усе яго персанажы маюць яркую індывідуальнасць і расказваюць кожны сваю гісторыю.

Між тым, успамінае мастак, яго жаданне маляваць вуглём ці мелам на ўсім, што трапляла пад руку, бацькі не падтрымлівалі і лічылі марнатраўствам, тым больш пасля вайны склалася было сур'ёзна адносіцца да набыцця прафесіі мастака. Роберт Яфімавіч кажа, што першыя ўрокі атрымаў ад цёткі Марыі — жонкі суседа, адоранай ад прыроды. Пад яе кіраўніцтвам напісаў сваю першую карціну, якую назваў «Лета майго дзяцінства». І ўсё ж атрымалася закончыць Ленінградскі інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя Рэпіна, пасля чаго ён назаўжды вярнуўся ў Гомель.

Асобнае месца ў Ландарскага займаюць карціны пра вайну. У дзяцінстве, пры эвакуацыі, яму з сям'ёй давялося трапіць пад бамбёжку і цудам выжыць. Менавіта таму мастак і дагэтуль не можа забыць тыя трагічныя падзеі.

Яшчэ адна беларуская драма знайшла адбітак на яго палотнах — Чарнобыль. Сваю «Палескую мадонну» ён называе і «чарнобыльскай». У тыя мясціны, што цяпер сталі запаведнымі і недаступнымі, Роберт Яфімавіч да аварыі на ЧАЭС любіў ездзіць на эцюды, якія спалучаў з рыбалкай. Там ён чэрпаў натхненне. Бяда, якая спасцігла поўдзень Гомельшчыны, сублімавалася ў чарнобыльскі цыкл.

На пытанне, колькі карцін за жыццё напісаў, адказвае: вераґодна, больш за дзве тысячы. Смяецца: аднойчы не адразу пазнаў свой даўні твор, калі пабачыў яго ў рэзідэнцыі Прэзідэнта. Цяпер, кажа, робіць «нашлёпачкі». Так называе невялічкія эцюды:

— У мяне ад дачы да Дняпра — 120 метраў. Прыходжу туды і кідаю ў рэчку болды — гэта такія вуды. Сяджу з эцюднічкам і пішу эскізы. Пасля гэтага іх пераводжу ў карціны.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

Далягляд

# У кніжных аазісах свету

**На адмысловай прэс-канферэнцыі беларусы распавялі, на якіх замежных кніжных кірмашах пабывалі, як сябе паказалі і што змаглі ўбачыць.**

Адной з такіх знакавых вандровак стала паездка на Варшаўскую кніжную выстаўку. Пра яе расказаў **намеснік міністра інфармацыі Беларусі Ігар БУЗОЎСКІ:**

— У Варшаве, у прыватнасці, цікавяцца беларускамоўнай кнігай. Магчыма, гэта звязана з нашай доўгатэрміновай працай у азначаным напрамку. Падчас выстаўкі былі сустрэчы, якія дазваляюць гаварыць пра перспектывы ўзаемадзеяння. Будзем выдаваць кнігі, у тым ліку на тэрыторыі Польшчы. Адзін з такіх праектаў прапанаваны і прэзентаваны Віктарам Корбутам (магчыма, ён будзе здзейснены пры сумесным фінансаванні беларускага і польскага бакоў). Корбуту ўдалося адшукаць малюнкі Чэслава Манюшкі — бацькі вядомага кампазітара. Гэта выявы, замалёўкі трох сталіц — Варшавы, Вільні і Мінска. Было адабрана 200 такіх малюнкаў. Ёсць ідэя выдаць выявы разам з фотаздымкамі тых жа месцаў, зробленымі ў сучаснасці. Атрымаецца такое цікавае параўнанне.

Пра наведванне XVI Санкт-Пецярбургскага міжнароднага кніжнага салона расказала **рэферэнт упраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Міністэрства інфармацыі Беларусі Вікторыя ЛУКАШУТЭ.** Яна таксама акцэнтавала ўвагу на тым, што замежнікі цікавяцца беларускамоўнай кнігай:

— Найперш да нас прыходзяць людзі, якія захоўваюць цікавасць з году ў год. Яны чакаюць, каб завітаць на беларускі стэнд, убачыць, што новага з'явілася. Прыходзяць не толькі расіяне, пецярбуржцы — людзі, якія маюць беларускія карані, але і тыя, каму проста падабаецца наша мова, літаратура. Тыя, хто чытаў нашых класікаў, сучасных аўтараў у перакладзе на рускую мову, а цяпер ім цікава прачытаць у арыгінале. Завітваюць па дзіцячую літаратуру — хочуць навучаць сваіх дзяцей беларускай мове. Да таго ж мы атрымалі дамоўленасці аб пашырэнні асартыменту беларускіх кніг у піцерскіх кнігарнях.

**Начальнік упраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Міністэрства інфармацыі Беларусі Алена ПАЎЛАВА** расказала пра наведванне беларускай дэлегацыяй II Універсальнай кніжнай выстаўкі-кірмашу «Пошук» у Палтаве. Дзякуючы нашай прысутнасці кірмаш атрымаў статус ужо не рэгіянальнага, а міжнароднага. Бібліятэцы палтаўскага ўніверсітэта былі перададзены беларускія кнігі, найперш навучальныя дапаможнікі, што пабачылі свет у выдавецтвах «Народная асвета» і «Вышэйшая школа». Гэтыя кнігі выклікалі такі рэзананс у мясцовых жыхароў, што на наступным тыдні будзе зладжана дадатковая адмысловая прэзентацыя беларускіх выданняў. Беларусы наведалі і мястэчка Гогалева каля Палтавы — радзіму знакамітага пісьменніка, дзе працуе яго дом-музей. Таксама там адкрылася новая бібліятэка, дзе пакуль што не было ніводнай кнігі. Першым асобнікам стала прывезенае з Мінска выданне малюнкаў Марка Шагала да «Мёртвых душ». Падарунак атрымаўся сапраўды яркі і ўнікальны.

Дарэчы, назва палтаўскай выстаўкі-кірмашу «Пошук», па словах Алены Паўлавай, расшыфроўваецца так: «Палтаўскі аазіс шанавальнікаў украінскай кнігі».

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

У мястэчку Гогалева каля Палтавы.



Культурныя стасункі

# Ушанаванне памяці беларускага класіка

**Памятная дошка ў гонар Янкі Купалы будзе ўсталявана ў Чабаксарах.**

Повязь народнага песняра Беларусі з далёкім прыволжскім краем зусім не выпадковая. Чытаем у энцыклапедыі «Янка Купала»: «ЧЭБАКСАРЫ, горад, сталіца Чувашыі (Расія). Купала спыніўся тут з У. Ф. Луцэвіч па дарозе ў Казань і прабыў з 27.10 да 11.11.1941. Жыў спачатку на кватэры С. В. Эльгера, потым у Доме селяніна. Сустракаўся з чувашскімі пісьменнікамі М. Шэлебі, С. Шаўлы, Я. Ухсаем, А. Эсхелем і інш. У 1955 адна з вуліц горада названа імем Я. Купалы».

Толькі што гарадскія ўлады сталіцы Чувашскай Рэспублікі прынялі рашэнне аб усталяванні на доме № 5 па вуліцы кампазітараў Вараб'ёвых, дзе жыў народны пясняр Беларусі ў 1941 годзе, памятнай мемарыяльнай дошкі.

Ініцыятарам рэалізацыі гэтай ідэі выступіла таварыства чувашска-беларускай дружбы, — расказвае народны паэт Чувашыі Валеры Тургай. — У нашай старонцы шануюць класіка беларускай літаратуры. Асабіста я нядаўна пераклаў «Санеты» Янкі Купалы на чувашскую мову. Не так даўно мы правялі вечар беларускай паэзіі ў гонар Янкі Купалы. Імя класіка беларускай літаратуры будзем згадваць і на фестывалі паэзіі, які пройдзе ў нас на пачатку чэрвеня.

Развіццё беларуска-чувашскіх літаратурных, культурных сувязяў — аснова добрых зносін Беларусі і Чувашскай Рэспублікі ў самых розных кірунках эканомікі, народнай гаспадаркі. Гэта добра разумеюць і ў Чабаксарах, і ў Мінску.

**Сяргей ШЫЧКО.**

Медыяпрастора

# «МЫ МОЦНА ЎПЛЫВАЕМ НА НАСТРОЙ ГРАМАДСТВА»

## Сакрэты ізраільскага радыёжурналіста

**XIV Беларускі міжнародны медыяфорум у Брэсце завяршыўся. Але засталіся слушныя думкі, важныя экспертныя тэзісы і адказы на пытанні, чым жывуць сучасныя сродкі масавай інфармацыі (і як далей жыць?). Мы прадстаўляем чытачам «Звязды» выказванні аднаго з замежных гасцей — галоўнага рэдактара ізраільскай радыёстанцыі «Першае радыё 89.1 FM» Уладзіміра ЗЯРНІЦКАГА:**



«Я прыехаў на форум у Брэст, каб зразумець, чым жывуць медыя, якія пішуць, транслююць па-руску. У Ізраілі сёння жыве 1,3 мільёна рускамоўных чалавек (кожны восьмы). Гэта яўрэі — выхадцы практычна з усіх былых рэспублік СССР, з краін СНД у тым ліку. Таму з'явілася неабходнасць у нашай радыёстанцыі.

**«Сучасны слухач — гэта частка радыёстанцыі, яе супрацоўнікі».**

Ментальнасць большай часткі рускамоўных, якія ўжо 25—30 гадоў пражылі ў новай краіне, змянілася. Іх найперш цікавяць ізраільскія навіны: і, на жаль ці на шчасце, навін у нас заўсёды надзвычай шмат, горача ва ўсіх сэнсах гэтага слова. Таму работа рускамоўнага СМІ збудавана так, што галоўнае месца займаюць навіны Ізраіля, Блізкага Усходу, стаўлення іншых да краіны — можа, не зусім карэктных. Толькі на трэцяй, чацвёртай пазіцыі ідуць навіны, якія прыходзяць з тых краін, з якіх гэтыя выхадцы прыехалі, — Расіі, Украіны, Беларусі. Як не дзіўна, выхадцаў з Украіны найбольш — каля 550 тысяч чалавек. Колькасна яны абыходзяць нават расіян. Таму створана праграма на ўкраінскай мове. Таксама ёсць перадача для выхадцаў з Сярэдняй Азіі і Усходу — «Дачка Каўказа». Мы не можам вяшчаць у адным фармаце, як гэта прынята на радыёстанцыях. Таму і музыка, якая ў нас гучыць, зусім розная: ад класікі да поп.

На форуме, дзе мы займаемся важнай праблемай — «Партнёрствам у імя будучыні», — натуральна, не пакідаем па-за ўвагай сродкі масавай інфармацыі ў той жа Расіі, Украіне, Малдове, Беларусі. Бо людзі ў Ізраілі (маю на ўвазе не толькі рускамоўных) надзвычай палітызаваныя: іх хвалюе ўсё, што адбываецца ў свеце. Яны не застаюцца абыякавыя і, ведаю дакладна, сочаць за тым, што адбываецца ў тых ці іншых краінах. Я ў сваім «Фэйсбуку» апісваю паездку — і дзясяткі, калі не сотні, людзей раяць мне, як быць, што рабіць, што гаварыць, куды пайсці: яны неабыякавыя і не забыліся!

**«Важна не толькі інфармаваць, але і абараняць сваё грамадства і сваіх людзей».**

Раскажу на канкрэтных прыкладах, што такое сродкі масавай інфармацыі і адказнасць нас як журналістаў і кіраўнікоў. Калі нашу радыёстанцыю Міністэрства сувязі вырашыла закрыць (быў такі перыяд), мы паведамілі пра гэта ў эфіры. І рускамоўныя ізраільцяне гатовыя былі выйсці на вуліцы і паліць пакрышкі — каб засталася радыёстанцыя. Бо ім патрэбна была крыніца інфармацыі, у тым ліку на рускай мове, — тая, якой давяраюць.

За 25 гадоў жыцця ў Ізраілі я зразумеў, што такое шчырая сапраўдная журналістыка. Уладальнік нашай радыёстанцыі — ізраільцянін, журналіст з 40-гадовым стажам — за амаль 17 гадоў майго кіравання радыёстанцыяй ні разу не даў каманду гаварыць пра нешта або некага лабіраваць. Таму мы дазваляем сабе прамаўляць усё, што думаем. За выключэннем, натуральна, ваеннай цэнзуры і таго, што забараняе казаць суд.

Сёння, калі сучасныя тэхналогіі абганяюць сродкі масавай інфармацыі, наш радыёслухач (ці глядач, чытач) робіцца непасрэдна супрацоўнікам. Бо гэты інтэрактыў, які цяпер існуе проста ў нерэальных аб'ёмах у выглядзе разнастайных месенджараў, робіць іх непасрэднымі ўдзельнікамі нашай працы. І мы ім вельмі ўдзячныя. 5 гадоў таму прымянілі такі досвед, калі эфір цалкам аддалі дзецям. Яны на радыё займаліся ўсім: навінамі, праграмамі, аглядам газет — прычым гэта былі дзеці ва ўзросце ад 8 да 14 гадоў. Умова — казаць усё па-руску. Сёлета, у Міжнародны дзень абароны дзяцей, яны будуць рабіць тое ж самае. Таму сучасны слухач — гэта частка радыёстанцыі, яе супрацоўнікі.

**«Не трэба забывацца, што мы, журналісты, — таксама частка народа, якая атрымлівае інфармацыю і з гэтай інфармацыяй жыве. Мы вельмі моцна можам уплываць на настрой грамадства і маніпуляваць ім. Гэта накладвае на нас вельмі вялікую адказнасць».**

Варта распавесці пра сумленную журналістыку. На маю думку, яна мае тры складнікі. Гэта адказнасць чалавека за тое, што ён піша, расказвае, паказвае. Гэта смеласць — не пабаяцца, магчыма, быць звольненым. Трэці фактар — кампетэнтнасць — таго, пра што вы расказваеце ці што перадаяце.

Не трэба забывацца, што мы, журналісты, — таксама частка народа, якая атрымлівае інфармацыю і з гэтай інфармацыяй жыве. Мы вельмі моцна можам уплываць на настрой грамадства і маніпуляваць ім. Гэта накладвае на нас вельмі вялікую адказнасць. Важна не толькі інфармаваць, але і абараняць сваё грамадства і сваіх людзей. У яўрэяў ёсць добры вопыт у гэтым сэнсе. Маісей 40 гадоў вадзіў народ па пустыні. Спачатку ён праінфармаваў людзей пра сыход з Егіпта, а потым, калі Усявышні даў яму 10 запаветаў, ён яшчэ і абараняў іх з дапамогай гэтых запаветаў. У нас, калегі, падобная місія. Мы таксама інфармуем і ахоўваем сваю супольнасць. Таму ў нас ёсць будучыня і ёсць мэта, да якой імкнуцца».

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

*г. Брэст.*

**ООО «Ревоканда»**
**(220073, г. Минск, а/я 87, Тел./факс (8-017) 259-18-53, (8-044) 540-75-62)**
**организатор торгов извещает о проведении открытых торгов в форме аукциона (на повыш. нач. цены) по продаже имущества ОАО «Молодечненский завод металлоконструкций» (УНП 600136845), а именно:**

– капитальное строение с инв. № 630/С-42631 (производственный корпус № 2) – начальная цена предмета торгов – 10 740 000 бел. руб. без учета НДС 20 %.

Ознакомиться с предметом торгов можно по месту его нахождения: г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 31А, предварительно согласовав дату и время с продавцом.

Шаг аукциона – 5 %.

Продавец – ОАО «Молодечненский завод металлоконструкций», тел. (8-029) 649-82-81, (8-025) 718-04-95, Денис Александрович.

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в бел. руб.

Победителем торгов является участник, предложивший наибольшую цену за предлагаемый к продаже лот. Договор купли-продажи заключается с победителем торгов в течение 5 календарных дней с даты проведения аукциона. Победитель торгов в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену за минусом внесенного задатка. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 (трех) календарный дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Лица, подавшие заявки на участие в торгах, имеют право отказаться от участия в торгах согласно регламенту торговой площадки. В случае признания торгов несостоявшимися в виду подачи заявления на участие только одним участником, возможна продажа данного объекта заявившемуся участнику, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Торги проходят на Единой системе Электронных торгов, по адресу: http://torgi.gov.by.Торги начинаются 28.06.2019 и длятся 1 день.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона производится победителем аукциона по фактическим затратам с учетом стоимости услуги торговой площадки. Порядок проведения торгов, условия, оформление участия в торгах определяются правилами проведения торгов, находящиеся по ссылке: https://torgi.gov.by/info/auction-rule».

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Планар» (продавец), проводит повторный открытый аукцион по продаже **здания многофункционального** (одноэтажное кирпичное с пристройкой) **общей площадью 1025,3 кв. м, инв. № 601/С-28859**, **расположенного на земельном участке площадью 0,9668 га с кадастровым номером 623288000016000002 (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, Логойский район, Янушковичский с/с, 10.** Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: *охранная зона линий электропередачи напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,9668 га). Часть здания пл. 239,4 кв. м сдается в аренду.*

**Начальная цена** с НДС (20 %) – **37 440,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **3 744,00** бел. руб.). Стоимость снижена на **60 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 (двух) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 23.01.2019, 12.03.2019, 09.04.2019. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **18.06.2019** в **15.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.06.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

**ООО «Мебельное предприятие «Веста» извещает о проведении 12 июня 2019 года повторного открытого аукциона по продаже имущества в 10.00 по адресу: г. Гомель, ул. Бабушкина, д. 1**

**Сведения о предмете торгов** (мебель, основные средства и материалы) и **начальной цене** предмете торгов размещены на сайте предприятия mpvesta.by.

**Место нахождения предмета торгов:** г. Гомель, ул. Бабушкина, д. 1.

**Продавец:** ООО «Мебельное предприятие «Веста», г. Гомель, ул. Бабушкина, д. 1.

Контактный тел. +375 44 748 30 56.

**Организатор торгов:** ликвидатор ООО «Мебельное предприятие «Веста» – Грамович Ольга Анатольевна, г. Гомель, ул. Бабушкина, д. 1, тел. +375 44 748 30 56.

**Шаг аукциона** – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме. Продажа имущества производится без учета НДС. **Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток в размере 10 % от начальной цены лота на расчетный счет Продавца № р/с BY12 AKBB 3012 0466 1677 8300 0000 в ф-ле 300 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21300, УНП 400560826.

**2.** Подать заявление продавцу по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Бабушкина, д. 1, в рабочие дни с 10.00 до 13.00 и 14.00 до 17.00. Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 10 июня 2019 г. в 17.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.

**3.** В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

**Для участия в аукционе представляются**: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем (далее – ИП) Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или ИП, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или ИП Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя или иные документы в соответствии с законодательством).

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 5 (пять) дней до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается безналичным платежом на счет в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти)** календарных дней со дня проведения торгов; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи.

Центр Промышленной Оценки
- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

| **Извещение о проведении аукциона** | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703 | | |
| **Продавец** | ОАО «Молодечненский станкостроительный завод», г. Молодечно, ул. Замковая, 19 | | |
| **Предмет аукциона** | | | |
| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
| **Здание блока вспомогательных цехов** (здание специализир. для металлургич. производства и металлообработки) | 2676,8 кв. м | 630/С-79012 | Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Замковая, 19/М |
| Составные части и принадлежности: навес на металлических столбах | | | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 172 543,81 бел. руб.** (снижена на 50 %) | | | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001** в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390. | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | 10 рабочих дней после проведения аукциона | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | | | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано газете «Звязда» от 16.05.2019 | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия. | | | |
| **Аукцион состоится 13.06.2019 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 12.06.2019 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; +375 29-317-95-42. www.cpo.by, e-mail: auction@cpo.by | | | |

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Старобинский» (продавец), проводит повторный открытый аукцион по продаже **административного здания с инв. № 644/С-57945 общей площадью 231,7 кв.м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625086202501000268 площадью 0,2191 га по адресу: Минская область, Солигорский район, Старобинский с/с, д. Саковичи, ул. Залужная, 2В.** Вид вещного права на земельный участок – право постоянного пользования. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: *ограничения прав на земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов, пл. 0,2191 га; охранная зона электрических сетей, напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0063 га.*

**Начальная цена – 25 500,00 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены (2 550,00 бел. руб.).**

**Условия продажи:**

- поддержание надлежащего санитарного состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 6 (шести) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 05.03.2019.

Аукцион состоится **19.06.2019** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.06.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

## РУП «Торговый дом «Восточный» извещает о проведении 18.06.2019 повторного открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

**Лот № 1.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-70776931 общей площадью 799,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Денисовская, 41-1Н. Назначение: административно-торговое помещение, наименование: административно-торговое помещение № 1Н. **Начальная цена продажи – 945 216,00 рубля, задаток – 94 521,60 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 2.** Капитальное строение с инвентарным номером 335/С-40619 общей площадью 138,3 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Петриковский р-н, г.п. Копаткевичи, ул. Социалистическая, 61-4. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование: здание склада запчастей, одноэтажное, кирпичное. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 324376000001000011 площадью 161,3212 га. **Начальная цена продажи – 23 328,00 рубля, задаток – 2 332,80 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 3.** Капитальное строение с инвентарным номером 235/С-5736, общей площадью 552,4 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Чашникский р-н, г. Чашники, пер. Молодежный, 4А. Назначение: здание административно-хозяйственное, наименование: административное здание. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 225150100001001622 площадью 3,7395 га. **Начальная цена продажи – 87 696,00 рубля, задаток – 8 769,60 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 4.** 1.Земельный участок с кадастровым номером 422086000003000008 номер 82, по адресу: Гродненская обл., Гродненский р-н, Обуховский с/с, СТ «Мигово» 82, площадью 0,0489 га, целевое назначение – садоводство в садоводческом товариществе.

2. Незавершенное строительство дома с мансардным этажом (садовый домик), размер 6 м х 8 м, назначение – садовый, дачный домик (дача), расположенное по адресу: Гродненская область, Гродненский район, Обуховский с/с, СТ «Мигово» 82, в комплексе с составляющими частями и принадлежностями (баня, сарай, ворота, калитка, ограждение, уборная). **Начальная цена продажи – 36 780,00 рубля, задаток – 3 678,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 5.** Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-72915, общей площадью – 48,4 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, Молодечненский р-н, Тюрлевский с/с, 2, Потребительский гаражно-строительный кооператив «Молодечно-36», 294. Назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – индивидуальный капитальный гараж. Расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623850100003002458. **Начальная цена продажи – 5 229,00 рубля, задаток – 522,90 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 6.** Капитальное строение с инвентарным номером 330/С-14042, общей площадью – 111,5 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская область, Мозырский р-н, Криничный с/с, СТ «Парус-1», участок № 293. Назначение: садовый, дачный домик (дача), наименование: двухэтажный силикатноблочный садовый домик (дача). Составные части и принадлежности: подвал под ним, мансарда, веранда, терраса, сарай. Расположенное на земельном участке с кадастровым номером 323581800002000068 площадью 0,0588 га. **Начальная цена продажи – 15 561,00 рубля, задаток – 1 556,10 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 7.** Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-30735 общей площадью 98,0 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Радошковичский с/с, СТ Текстильщик-2002, д. 34. Назначение: садовый домик, наименование: садовый домик. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623883700011000061 площадью 0,0411 га. Начальная цена продажи – 17 712,00 рублей, задаток – 1 771,20 рублей. Шаг аукциона – 5 %.

**Лот № 8.** Капитальное строение с инвентарным номером 242/С-2363, общей площадью 17,0 кв. м, расположенное по адресу: Витебская область, Сенненский район, г. Сенно, ул. Красноармейская, д. 73. Назначение: здание специализированное иного назначения, наименование: котельная. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 224450100001000175 площадью 1.4526 га. **Начальная цена продажи – 648,00 рубля, задаток – 64,80 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 9.** Капитальное строение с инвентарным номером 242/С-2361, общей площадью 316,0 кв. м, расположенное по адресу: Витебская область, Сенненский район, г. Сенно, ул. Красноармейская, д. 73. Назначение: здание специализированное иного назначения, наименование: мастерские. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 224450100001000175 площадью 1,4526 га. **Начальная цена продажи – 8 928,00 рубля, задаток – 892,80 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 10.** Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-78250, общей площадью 64,4 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, СТ «Удачное», д. Скоки, 25. Назначение: садовый, дачный домик (дача), наименование: садовый домик. Составные части и принадлежности: мансарда, сарай, уборная. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 121283000015000053 площадью 0,0600 га. **Начальная цена продажи – 20 880,00 рубля, задаток – 2 088,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 11.** Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-82934 общей площадью 22,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Фроленкова, 190/29, блок 4. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: гараж. Составные части и принадлежности: бетонный погреб. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 141000000003000850 площадью 4,8088 га. **Начальная цена продажи – 2 160,00 рубля, задаток – 216,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 12.** Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-141731, общей площадью 641,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Подгорная, 10. Назначение: здание неустановленного назначения, наименование: здание наплавки валов. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 340100000001000529 площадью 6,8363 га. **Начальная цена продажи – 146 016,00 рубля, задаток – 14 601,60 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 13.** Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-47113 общей площадью 656,1 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл.,г. Брест, ул. Городская, 60А. Назначение: здание административно-хозяйственное, наименование: хозяйственно-бытовой корпус. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 121200000001000050 площадью 0,9576 га. **Начальная цена продажи – 162 432,00 рубля, задаток – 16 243,20 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 14.** Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-28350 общей площадью 1908,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Городская, 60А/1. Назначение: здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование: здание участка деревообработки, составные части и принадлежности: металлический навес, асфальтобетонное покрытие. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 121200000001000050 площадью 0,9576 га. **Начальная цена продажи – 344 736,00 рубля, задаток – 34 473,60 рубля. Шаг аукциона – 5 %**

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов) – Претендент на покупку, не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством РБ для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляется в соответствии с действующим законодательством РБ.
3. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «недвижимость»

**Аукцион состоится 18.06.2019 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал**

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) с отметкой банка, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 14А, управление реализации недвижимости и арендных отношений в рабочие дни: пн. – чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15. Окончание приема заявлений – 13.06.2019 в 14.00.

Задаток перечисляется на р/с BY81POIS30120021178401933001, БИК POISBY2X, ОПЕРУ ОАО «Паритетбанк», 220002, г. Минск, пр-т Независимости, 77, ОКПО 37411910, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот № ___, проводимом 18 июня 2019 года.

**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменном указанию Департамента в любое время до объявления его проданным**

**Контакты организатора аукциона: +375 17 351 00 01; +375 17 380 27 37; +375 44 763 62 63**

Прачытаў — перадай другому: *Сумесны праект Нацыянальнай бібліятэкі і газеты «Звязда»*

Да 75-годдзя вызвалення 1944 2019

# «ЯК РОДНЫХ БРАТОЎ І СЫНОЎ, ПРЫЦІСКАЛІ ЛЮДЗІ ДА СВАІХ ГРУДЗЕЙ САВЕЦКІХ ВОІНАЎ...»

## Што партызанскія газеты пісалі пра вызваленне

**«7 гадзін раніцы. У невялікім пакойчыку сялянскай хаты шумна і цесна. Сюды прыйшлі партызаны і сяляне, дарослыя і моладзь. Кожны з нецярпеннем чакае новых паведамленняў Савецкага Інфармбюро... Пятро чытае аператыўную зводку. Яго апошнія словы тонуць у гарачых воплесках прысутных. Усе накіроўваюцца да карты і адшукваюць знаёмыя назвы родных савецкіх гарадоў — Ельні, Глухава, Рыльска і іншых... У адказ на перамогі Чырвонай Арміі сяляне накіроўваюць у партызанскія атрады абозы з хлебам», — пісаў «Большэвік Палесся» ў верасні 1943 года. Партызаны праводзяць агітацыйную работу не толькі ў вёсках, яны пранікаюць нават у варожыя гарнізоны, засыпаюць улёткамі паліцэйскіх. У выніку ў гэты час нярэдка былыя праціўнікі пераходзяць на бок партызан...**

### «НАБЛІЖАЕЦЦА ЧАС РАСПЛАТЫ»

Звесткі з франтоў аб перамогах Чырвонай арміі ўзнімаюць людзей на барацьбу. Як паведамляла ў лютым 1943 года газета «Партызан» (орган Суражскага райкама партыі), партызаны адчуваюць штодзённую велізарную дапамогу з боку насельніцтва — не толькі матэрыяльную, але і яшчэ інфармацыйную. Вылазкі народных мсціўцаў робіцца больш дзёрзкімі, да таго ж ім трэба бараніць населеныя пункты — пры адступленні немцы рабуюць насельніцтва, гоняць грамадзян на катаргу, паляць вёскі. Таму партызанскія газеты пастаянна звяртаюцца да чытачоў з заклікам узнімацца на ўзброеную барацьбу ў тыле ворага і такім чынам набліжаць перамогу.

26 жніўня 1943 года газета «За Савецкую Беларусь» друкуе прамову Якуба Коласа «Набліжаецца час расплаты». «Дарагія мае сёстры і браты беларусы! Я ведаю, як цяжка вам жыць пад ярмом нямецкага ката — Гітлера, — звяртаецца народны пісьменнік. — Верце ж, што Гітлер сёння блізка, як ніколі, стаіць над краем сваёй прадоння. Дні Гітлера злічаны. Вы ўжо перажылі сваю цяжкую поўнач. Хвіліна за хвілінаю час ідзе к світанню. Памятайце: больш за ўсё баяцца немцы вайны на сваёй зямлі. Вось чаму яны, як кляшчы, упіліся ў нашу зямлю, пабудавалі на ёй крэпасці, каб аддаліць час сваёй пагібелі...»

Часам партызанскія газеты друкуюць і перахопленыя лісты нямецкіх салдат. З ліста Білі Бека са станцыі Рудзенск (надрукавана ў газеце «Большэвіцкі сцяг» 7 студзеня 1944 года): «Учора быў у камандзіроўцы ў Мінску. Усю ноч быў у дарозе. Гэта самы цяжкі шлях па рускім прасторы. Не ведаю, як астаўся жывы. Партызаны не даюць ні выйсці, ні праехаць. А Гітлер яшчэ гаворыць пра перамогу. Знішчаць нас тут, калі крыху спознімся ўцячы».

У кожным кутку Беларусі жыхары з нецярпеннем чакалі свежую прэсу, каб даведацца з яе пра тое, якія населеныя пункты ўжо ачышчаны ад ворага. Некаторыя газеты друкавалі карты з інфармацыяй пра становішча на франтах, расказвалі, як насельніцтва яшчэ не вызваленых раёнаў рыхтуецца да сустрэчы з Чырвонай арміяй. Дзяўчаты вышывалі ў падарунак салдатам кашулі і насоўкі, сяляне перадавалі партызанам зброю.

### РАДАСНАЯ СУСТРЭЧА

На вызваленых тэрыторыях ладзяцца сапраўдныя святы, адбываюцца мнагалюдныя мітынгі. «Вестка аб сустрэчы з прадстаўнікамі роднай Чырвонай Арміі хутка абляцела ўсе зямлянкі і лясныя курані. Са слязамі радасці на твары насустрач франтавікам выбягаюць старыкі і бабулькі, жанчыны і дзеці», — пісаў «Большэвік Палесся» 5 снежня 1943 года.

«Бязмежная радасць, непераддаваемае лікаванне ахвацілі ўсё насельніцтва пры сустрэчы з воінамі-вызваліцелямі. Як родных братоў і сыноў, прыціскалі людзі да сваіх грудзей савецкіх воінаў, пакрывалі іх мужныя твары гарачымі пацалункамі. Дзеці засыпалі герояў кветкамі...


Смерць нямецкім акупантам! Прачытай — перадай другому

Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

БОЛЬШЭВІЦКІ СЦЯГ

X Сесія Вярхоўнага Савета СССР 1-га склікання

На франтах Айчыннай вайны



«Большэвіцкі сцяг» піша пра адступленне немцаў.

Сустрэча з савецкімі воінамі ў вёсках нашага раёна ператварылася ў народнае свята. На вуліцах доўгімі радамі стаялі сталы, перапоўненыя багатымі пачастункамі...

Хвалюючай і радаснай была сустрэча доблесных воінаў-вызваліцеляў з народнымі мсціўцамі. Савецкія патрыёты нашага раёна дапамаглі наступаючым часцям Чырвонай Арміі, заняўшы раённы цэнтр г. Узда і ўтрымаўшы яго да падыходу рэгулярных савецкіх войск», — паведамляла 7 ліпеня 1944 года газета «За Савецкую Радзіму».

### ВЯРТАННЕ

21 жніўня 1943 года Саўнаркам СССР і Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Камуністычнай партыі прынялі гістарычную пастанову «Аб неадкладных мерах па аднаўленні гаспадаркі ў раёнах, вызваленых ад нямецкай акупацыі». Згодна з ёй, на гэтыя землі павінны былі вярнуцца з тылавых тэрыторый Савецкага Саюза раней эвакуіраваныя жывёла і сельгастэхніка, аказвалася матэрыяльная дапамога па набыцці ўсяго неабходнага для развіцця сельскай гаспадаркі. Праводзілася дзяржзакупка ўсіх відаў жывёлы для вызваленых абласцей. Для забеспячэння плана сяўбы азімых культур пад ураджай 1944 года адпускалася ў парадку пазыкі калгасам з дзяржаўных рэсурсаў 50 000 тон збожжа. Ішлі вялікія сумы на будаўніцтва рамонтных майстэрань, адгружалася абсталяванне, паліва. Гаспадаркі вызваляліся ад падаткаў.

Для дзяцей воінаў Чырвонай Арміі і партызан, а таксама для малых сірот, бацькі якіх загінулі ад рук нямецкіх акупантаў, ужо ў 1943 годзе пачалі адкрывацца суворaўскія ваенныя вучылішчы, спецыяльныя рамесныя вучылішчы, дзіцячыя дамы і дзіцячыя прыёмнікі-размеркавальнікі. У гэтых установах дзеці знаходзіліся на поўным дзяржаўным забеспячэнні.

У раёнах Беларусі, вызваленых ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, хуткімі тэмпамі аднаўляліся разбураныя школы. Так, 5 верасня 1943 года «Большэвік Палесся» пісаў: «У Магілёўскай вобласці прыступілі ўжо да работы 193 школы, у Гомельскай вобласці — 38 школ, у Віцебскай — 19 школ, у Палескай вобласці — 9 школ. Рыхтуюцца да адкрыцця яшчэ 120 школ, для якіх рэмантуюцца памяшканні. У працуючыя школы завезена звыш 100 тысяч сшыткаў і іншыя навучальныя прылады. Днямі ў горадзе Мсціслаўль пачынае сваю работу Беларускае педагагічнае вучылішча. У вызваленых раёнах Магілёўскай вобласці будзе адчынена 6 дзіцячых дамоў».

Не сядзелі без справы моладзь і дзеці. Так, камсамольцы Полацка рамантавалі дзіцячы дом. У сваю чаргу, юныя выхаванцы гэтай дзіцячай установы прымалі ўдзел у нядзельніках па аднаўленні горада, збіралі цвікі і дрот на рамонт гарадской лазні. У Полацкім раёне ў хуткім часе пасля вызвалення пачалі работу трохмесячныя курсы трактарыстаў, дзе навучаліся 100 хлопцаў і дзяўчат.

У вызвалены Гомель і на суседнія тэрыторыі пачалі паступаць тавары шырокага спажывання, у тым ліку адзенне, абутак, тканіна, прадукты харчавання. «На працягу двух з лішнім гадоў нямецкай акупацыі працоўныя Гомеля і другіх зараз вызваленых раёнаў зусім не атрымлівалі солі, мыла. У гэтых прадметах адчуваецца найбольшая патрэбнасць. У адрас вызваленых раёнаў ідзе 2000 тон солі і 30 тон мыла.

Для хутчэйшага аднаўлення разбураных дамоў кожнаму калгасніку адпускаецца па 30 кубаметраў леса» («Большэвік Палесся» за 5 снежня 1943 года).

Паступова людзі з зямлянак пачынаюць перабірацца ў новыя дамы. У лютым 1944 года «Большэвіцкі сцяг» піса, што ў вызваленых раёнах адноўлена і пабудавана больш за 326 тысяч дамоў, у якіх цяпер жыве больш за 1800000 калгаснікаў, рабочых і служачых.

Аднаўляецца Гомельскі паравозавагонарамонтны завод — сюды рабочыя прынеслі інструменты і матэрыялы, якія ім удалося прыхаваць ад немцаў у час акупацыі. У вёсцы Уза Гомельскага раёна адкрыўся гукавы кінатэатр, разлічаны на 300 месцаў.

З першых дзён пасля вызвалення закіпела работа ва Уздзе. Хутка запрацавалі адрамантаваныя млын, вінакурны завод, хлебапякарня, бальніца, цырульня, электрастанцыя, лазні, грамадская сталоўка.

У ліпені 1944 года газеты друкуюць указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «Аб павелічэнні дзяржаўнай дапамогі цяжарным жанчынам, шматдзетным і адзінокім маці, умацаванні аховы мацярынства і дзяцінства, аб устанаўленні ганаровага звання «Маці-гераіня» і ўстанаўленні ордэна «Мацярынскі гонар» і медаля «Медаль мацярынства».

Каб дапамагчы жанчынам, якія пасля вайны сталі ўдовамі альбо апынуліся ў цяжкім матэрыяльным становішчы, прадугледжаны быў шэраг мерапрыемстваў. Так, дзяржаўная дапамога стала выдавацца жанчынам пры нараджэнні трэцяга дзіцяці і наступных (а да гэтага яна выдавалася толькі маці, якія мелі шэсць і болей дзяцей). Падтрымка пачала аказвацца адзінокім маці (якія не знаходзяцца ў шлюбе), павялічыўся адпачынак па цяжарнасці і родах. Прадпісвалася неабходнасць пашырэння сеткі дзіцячых кансультацый і малочных кухань, арганізацыі ясляў для немаўлят, вячэрніх груп пры дзіцячых садках, радапаможных установ у раёнах, вызваленых ад нямецкіх захопнікаў. Зацвярджаліся мерапрыемствы па пашырэнні вытворчасці дзіцячай вопраткі, абутку, сродкаў дзіцячай гігіены і санітарыі. А з халасцякоў, адзінокіх і маласямейных грамадзян браўся падатак.

### І ГАСПАДАРКУ НЕ ПАЗНАЦЬ

Яшчэ ішла вайна, а на палях і сенажацях кіпела праца. Людзі верылі, што перамога непазбежная, і разумелі, што краіне і фронту патрэбны хлеб і іншыя прадукты, кармы. Да таго ж трэба было думаць на перспектыву — пра аднаўленне гаспадарак. Большасць працаздольных мужчын забрала вайна, і цяжкая праца лягла на жанчын, старых і падлеткаў.

Сельская гаспадарка Беларусі моцна пацярпела за час акупацыі. «Нямецка-фашысцкія захопнікі ў нашым раёне знішчылі амаль усю жывёлу калгасаў і калгаснікаў, — пісала газета «Сацыялістычная перамога», орган Быхаўскага райкама КП(б)Б. — На калгасных фермах, з меўшыхся да вайны 8615 галоў, не засталося ніводнай каровы і толькі 14 процантаў коней. Свінагадоўчыя, аўцагадоўчыя і птушкагадоўчыя фермы фашысцкія звяры зжэрлі і варварскі знішчылі. Знішчаны і добра абсталяваныя памяшканні жывёлагадоўчых ферм.

З дапамогай калгаснікаў усходніх абласцей і рэспублік Савецкага Саюза ў калгасах раёна ўжо створана 98 ферм буйнай рагатай жывёлы, 45 аўцагадоўчых ферм і 48 птушкаферм».

Учарашнія партызаны ўзначальваюць калгасы і хутка падымаюць гаспадаркі. «Там, где когда-то было цветущее село, где стояли клуб, кинотеатр, школа, больница, сотни прекрасных домов — сейчас осталось одно пепелище. Из землянок вышли женщины с маленькими детьми.

Прошло 8 месяцев, а не узнать нынче деревню Ямполь. Построено около 50 новых изб. Колхозы имеют ферму крупного рогатого скота, овцеводческую, птицеводческую фермы. Заканчивается строительство большой конюшни», — у ліпені 1944 года пісала газета «Бей фашистскую гадину».

Дзякуючы таму, што аказвалася дапамога з насеннем, беларусы павялічвалі аб'ёмы работ. «У 1945 годзе намячаецца далейшае пашырэнне пасяўных плошчаў, давядзенне іх да даваеннага часу», — пісала «Сацыялістычная праца» (орган Расонскага РК КП(б)Б) у снежні 1944 года.

Велізарную дапамогу Беларусь атрымала ад суседзяў. У 1944 годзе сюды ідуць эшалоны з Новасібірска, Іжэўска, Яраслаўля і Ульянаўска са станкамі, трактарамі, абсталяваннем для кузняў, стаялярных, швейных і іншых майстэрняў, абсталяваннем і інвентаром для бальніц, школ, дзіцячых дамоў і г. д. З саюзнага бюджэту выдзяляюцца вялікія сумы.




**«Чырвоны сцяг» на карце паказвае, якая тэрыторыя вызвалена ад захопнікаў.**

«Для адраджэння народнай гаспадаркі ў вызваленых раёнах Беларусі ўрадам асігнавана ў бюджэт Беларускай Сацыялістычнай Рэспублікі 429 мільёнаў рублёў. Вялікае значэнне гэтай дапамогі бачна з таго, што для вызваленых раёнаў, якія пакуль яшчэ не маюць дастатковых крыніц прыбытку па зацверджанаму бюджэту, вызначаецца 329 мільёнаў рублёў датацыі за лік саюзных сродкаў, — паведамляў старшыня Савета народных камісараў Беларускай ССР П. К. Панамарэнка на VI сесіі Вярхоўнага Савета БССР, якая прайшла 21 сакавіка 1944 года ў Гомелі. — На аднаўленне асноўных галін прамысловасці ўрад Саюза выдзеліў станкі, аўтамашыны, метал, лес, турбіны і генератары.

Для сельскай гаспадаркі ўжо завезена больш 1500 трактараў.

Дзяржава закупляе ў калгасах і ў калгаснікаў усходніх абласцей СССР і перадае беларускім калгаснікам 13 тысяч коней, 80 тысяч галоў буйнай рагатай жывёлы, 130 тысяч авечак і коз, 50 тысяч галоў свіней, 150 тысяч галоў дарослай птушкі і 350 тысяч яек для інкубатараў.

На выдаткі, звязаныя са зваротам эвакуіраванай жывёлы, асігнавана ўрадам 1 мільён рублёў. Для будаўніцтва жывёлагадоўчых пабудоў і ветэрынарных установ выдзначана 350 тысяч кубаметраў лесу, 30 тон цвікоў, 50 тон сартавога жалеза, 10 тысяч квадратных метраў шкла».

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# АЖЫЯТАЖ НА «ДАХУ СВЕТУ»

## Чаму пакарэнне Эверэста пераўтварылася ў фатальную «рулетку»?



Фотаздымак доўгай чаргі на Эверэст, зроблены колішнім спецназаўцам і гвардзейцам-гуркхам (падраздзяленні, якія набіраюцца з непальскіх добраахвотнікаў) Нірмалам Пуржам, абляцела сацсеткі і ўразіла многіх каментатараў. Гэта і нядзіўна, паколькі большасць уяўляе найвышэйшы пік свету ціхім, заснежаным і бязлюдным месцам. Між тым падчас узыходжання на Эверэст і спуску з вяршыні толькі на працягу мінулага месяца загінула больш чым дзесяць чалавек. Гэта турысты з Індыі, Ірландыі, Непала, Аўстрыі і ЗША. Усяго ў Гімалаях у сёлетнім вясновым сезоне загінула ўжо звыш двух дзясяткаў чалавек — гэта больш, чым за ўвесь 2018 год. На мінулым тыдні быў пастаўлены яшчэ адзін сумнеўны рэкорд: толькі за адзін дзень на Эверэст падняліся 200(!) чалавек, а гэтага ім давялося колькі гадзін прастаяць у чарзе на схіле. Чым абумоўлены фатальны ажыятаж на «даху свету»?

### КРАІНА БАГОЎ

Над непальскай далінай Катманду, дно якой ляжыць на вышыні тысячы метраў над узроўнем мора, Гімалаі ўзвышаюцца на сем кіламетраў! Такога не ўбачыш больш нідзе ў свеце. Высокія непрыступныя горы з даўніх часоў выклікалі ў людзей два пачуцці: страх і шанаванне. Індусы называлі гэты раён Дэвіябхуні — «краіна багоў». Тут, на іх думку, знаходзіўся цэнтр Зямлі, пазначаны свяшчэннай гарой Меру, вакол якой круцяцца Сонца, Месяц і зоркі.

Меру ў Індыі атаясамлялі з гарой Кайлас у тыбецкіх Трансгімалаях. Побач з ёй, каля свяшчэннага возера Манасаровар, як вераць мясцовыя жыхары, жыве галоўны з трох вярхоўных багоў індуісцкага пантэона — Індра, грамабой, які дорыць дождж і ўрадлівасць палеткам. Іншы вялікі бог, Шыва, таксама жыве непадалёк — на гары Гаўрызанкар. І толькі Рама пасяліўся бліжэй да людзей, у даліне. Дарэчы, заснавальнік яшчэ адной сусветнай рэлігіі — царэвіч Гаўтама (будучы Буда) — таксама нарадзіўся тут, у Непале, 2500 гадоў таму. Таму мноства паломнікаў прыходзяць кожны год сюды, да святыні Будызму, храма Мукцінатх, дзе гарыць вечны агонь у памяць аб нараджэнні бажаства.

Утварэнне гімалайскай горнай краіны геолагі звязваюць з расколам адзінага паўднёвага прамацерыка — Гандваны — на некалькі пліт. Адна з іх, Індыйская, пачала рухацца на поўнач і сутыкнулася з Еўразійскай плітой. У месцы «сустрэчы» зямная кара сціснулася і ўтварыла гіганцкую закамянелую хвалю — Гімалаі. Рост яе, дарэчы, працягваецца і па сённяшні дзень. Кожны год Гімалаі становяцца вышэйшымі на тры — дзесяць міліметраў.

Цяпер у самым магутным горным хрыбце свету налічваецца 75 вяршынь «ростам» больш як сем кіламетраў. А ў найвышэйшай яго частцы — непальскіх Гімалаях — дзевяць пікаў уздымаюцца на восем тысяч метраў і больш. Сярод іх — і галоўная гара свету, якую ў Непале называюць Сагарматха («Уладар неба»), а ў Тыбеце — Джамалунгма («Багіня — маці свету») — 8848 метраў над узроўнем мора. Ужо па назвах зразумела, што народы Гімалаяў абагаўлялі гэтую вяршыню, нават не падазраючы пра тое, што яна — найвышэйшы пункт нашай планеты. Бо толькі ў 1852 годзе англійскія тапографы вызначылі дакладную вышыню піка XV, як яны называлі яго ў той час. Пазней гары прысвоілі імя начальніка тапаграфічнай службы Індыі маёра Джорджа Эверэста. Так і жыве цяпер найвышэйшая вяршыня свету пад трыма назвамі.



### ТРЭЦІ ПОЛЮС

Зразумела, што альпіністы канца XIX — пачатку XX стагоддзя, якія ўжо здолелі скарыць Матэрхорн у Альпах (у 1865 годзе), Чымбараса і Аканкагуа ў Андах (у 1880 і 1897 гадах), Мак-Кінлі на Алясцы (у 1913 годзе) і Кіліманджара ў Афрыцы (у 1889 годзе), гарэлі жаданнем узысці на недасягальны Эверэст. Але тыбецкія і непальскія ўлады да пачатку 1920-х не дазвалялі замежнікам парушаць спакой святых гор. У 1921—1924 гадах знакаміты англійскі альпініст Джордж Мэлар здзейсніў тры экспедыцыі да заваблачнай вяршыні, спадзеючыся стаць яе пераможцам.

У апошняй сваёй спробе — у 1924-м — ён і яго спадарожнік Ірвін, відаць, дасягнулі найвышэйшага пункту планеты. Тыя члены іх экспедыцыі, якія засталіся ўнізе, заўважылі адважную двойку ў бінокль літаральна за дзвесце метраў ад вяршыні, пасля чаго іх ахінуў туман. Больш ужо ніхто не ўбачыў першапраходцаў Джамалунгмы жывымі. Назад яны не вярнуліся. І толькі праз семдзесят пяць гадоў, у 1999-м, у снягах недалёка ад вяршыні было знойдзена цела Мэлара. Па ўсёй верагоднасці, падчас спуску альпіністы патрапілі ў завіруху і замерзлі.

Паспяховы штурм Джамалунгмы адбыўся толькі праз трыццаць гадоў пасля трагічнай спробы Мэлара і Ірвіна. У 1953-м на вяршыню гары ступілі новазеландзец Эдмунд Хілары і непальскі горац-шэрпа Наргей Тэнсінг. Такім чынам, «вышынны полюс» нашай планеты аказаўся самым моцным арэшкам з усіх запаветных і цяжкадасягальных пунктаў зямной паверхні, узятых штурмам у мінулым стагоддзі. Варта згадаць, што Паўночны і Паўднёвы полюсы скарыліся чалавеку больш чым на сорак гадоў раней, а арктычны Полюс недаступнасці — на пяць.

Наогул жа гісторыя штурму гімалайскіх «васьмітысячнікаў» — гэта цэлая эпапея, якая цягнулася пятнаццаць гадоў: ад 1950-га, калі адважныя французы Эрцаг і Ляшэналь пакарылі першы з іх — Анапурну, і да паспяховага ўзыходжання на самую цяжкую з гэтых вяршынь — гару Шыша-Пангма — кітайскай экспедыцыі ў 1964 годзе. Нямала трагічных старонак упісана ў гісторыю ўзыходжанняў. Сотні альпіністаў назаўсёды засталіся на схілах «краіны багоў». І ўсё ж штогод новыя вышынныя экспедыцыі няспынна адпраўляюцца ў Гімалаі. А на пытанне, што іх штурхае на гэтую найцяжэйшую і надзвычай небяспечную справу, у свой час выдатна адказаў Мэлар. Калі яго спыталі, чаму ён так імкнецца на Эверэст, ён заўважыў: «Таму, што ён ёсць!».



### АФІЦЭРЫ ЗАСТАЛІСЯ ПА ДАМАХ

Як вядома, на Эверэст, які размешчаны на мяжы Непала і Кітая, можна ўзысці і з кітайскага боку. Аднак улады Паднябеснай выдаюць менш ліцэнзій на ўзыходжанне, да таго ж многія спартсмены лічаць тыбецкі маршрут менш цікавым. У XXI стагоддзі сярэдняя смяротнасць сярод альпіністаў на Джамалунгме складала прыкладна шэсць чалавек у год. Сёлета жалобныя лічбы ўжо вышэйшыя. Летась Эверэст пакарылі 809 чалавек (563 — з боку Непала, па паўднёвым маршруце, і 246 — з боку Тыбета, па паўночным). Падобна на тое, што ў 2019-м вынік будзе пераўзыдзены. У гэтым годзе ўрад Непала выдаў рэкордную колькасць ліцэнзій на ўзыходжанне — 381. Гэта азначае, што каля 600 чалавек адправіліся ў экспедыцыю на вяршыню свету, паколькі спартсменаў суправаджаюць насільшчыкі.

Цана адной ліцэнзіі — $11 000 у Непале і $8000 — у Тыбеце. Але гэта толькі меншая частка цаны ўзыходжання. Увогуле, пуцёўка на вяршыню абыдзецца альпіністам ад $30 000 да $130 000. Кампанія Alpine Ascents, напрыклад, бярэ за тур на вяршыню Эверэста $70 000. У гэтую цану ўваходзяць дзве ночы ў Катманду перад узыходжаннем, якасная ежа і вада, урач у базавым лагеры, неабходнае для дасягнення абсталяванне, кісларод, медыкаменты, паслугі шэрпа і насільшчыкаў. Пад'ём да вяршыні займае каля тыдня. На вышыні 8000 метраў людзі праводзяць усяго некалькі гадзін, на самым верхнім пункце — некалькі хвілін. Адзінае, чаго не гарантуюць арганізатары, — пазбавіць ад затораў на грэбні, які вядзе да вяршыні.

Сёлета сезон распачаўся позна: многія альпіністы прыбылі ў базавы лагер каля падножжа піка толькі ў пачатку мая. Улады былі занепакоены наступствамі цыклону Фані, які да таго часу прычыніў нямала разбурэнняў у Індыі і Бангладэшы. Надвор'е ў непальскай частцы Гімалаяў пагоршылася ў мінулым месяцы праз некалькі дзён пасля прыходу цыклону, прымусіўшы прыпыніць усе ўзыходжанні на двое сутак. Працяглая непагадзь затрымала работы па ўстаноўцы вяровачных ўсходаў, якія дапамагаюць альпіністам дабрацца да вяршыні. Тым часам колькасць людзей у базавым лагеры працягвала павялічвацца.

Да сярэдзіны мінулага месяца вяровачныя лесвіцы нарэшце ўсталявалі, надвор'е палепшылася — 19—20 мая з'явілася першае спрыяльнае па ўмовах надвор'я «акно» для ўзыходжання. Аднак толькі некалькі груп вырашылі рухацца ўверх гэтымі днямі, большасць прынялі рашэнне чакаць другога «прасвету» з 22 па 24 мая. Эксперты адзначаюць, што менавіта ў гэтыя дні на гары было асабліва шматлюдна. 23 мая колькасць альпіністаў, якія рушылі ў дарогу наверх, перавысіла 250 чалавек. Ім даводзілася гадзінамі чакаць сваёй чаргі на камяністым схіле пад вяршыняй як пры ўздыме, так і пры спуску. Многія з альпіністаў да таго часу моцна стаміліся. Кісларод у іх балонах заканчваўся.

Правілы ўзыходжання, уведзеныя ўладамі Непала, патрабуюць прысутнасці ў складзе груп альпіністаў афіцэраў сувязі. Іх паслугі аплачваюцца экспедыцыямі, але нярэдка тыя проста застаюцца дома. Калі б усе гэтыя афіцэры сувязі былі на сваіх месцах, то справіцца з лішкам людзей было б значна лягчэй, лічыць адзін з прадстаўнікоў непальскіх уладаў. «Мы маглі б размеркаваць групы альпіністаў так, каб максімальна выкарыстоўваць «акно» 19—20 мая, што знізіла б колькасць узыходаў падчас другога «акна», — адзначыла крыніца Бі-бі-сі. Як паведаміў кіраўнік секцыі альпінізму ў міністэрстве турызму Непала Свету Ачар'я, 80 працэнтаў прызначаных афіцэраў сувязі не з'явіліся ў маі нават у базавы лагер.

### ЗЯЛЁНЫЯ ЧАРАВІКІ

Эксперты заўважаюць, што ўсё часцей у базавы лагер каля падножжа Эверэста прыбываюць недасведчаныя альпіністы. Сёлета многія з іх мелі толькі аднаго праваднікa-шэрпа ў складзе каманды. «Калі складваецца падобная небяспечная сітуацыя, адзін праваднік не зможа вам дапамагчы, паколькі яму даводзіцца клапаціцца пра ўласную бяспеку», — паведаміў Бі-бі-сі адзін з непальскіх чыноўнікаў. Некаторыя з альпіністаў, якія паспяхова вярнуліся ў базавы лагер пасля ўзыходжання, кажуць, што бачылі на схіле людзей, у якіх канчаўся кісларод, таму што ім гадзінамі даводзілася чакаць сваёй чаргі. «Гэта новае пакаленне альпіністаў, якія поўныя жадання дабрацца да вяршыні, каб потым выхваляцца дома, — заўважыў Алан Арнет, дасведчаны альпініст і журналіст. — Такія людзі лічаць сябе «незалежнымі альпіністамі», але на справе яны не валодаюць дастатковым вопытам для ацэнкі рызыкі».

Сёлетняя максімальная колькасць ліцэнзій на Эверэст тлумачыцца ў асноўным наймацнейшай канкурэнцыяй паміж аператарамі, якія арганізоўваюць узыходжанні. У апошнія гады на рынак выйшла мноства новых фірмаў, якія прапаноўваюць больш нізкія цэны, што прымушае больш дасведчаных «старажылаў» зніжаць свае расцэнкі. «У выніку агенцтвы маюць недасведчаных людзей у якасці праваднікоў, якія не ў стане справіцца з падобнымі сітуацыямі», — адзначыў віцэ-прэзідэнт непальскай нацыянальнай асацыяцыі праваднікоў Тшэрын Пандэ Бхотэ.

За ўсю гісторыю сучаснага альпінізму на Джамалунгме загінулі 288 чалавек (усяго ў Гімалаях — 572). Амаль палова сталі ахвярамі лавін, у кожнага пятага прычынай смерці было падзенне ў бездань, на вострую гіпаксію і іншыя праявы горнай хваробы прыпадае 16 працэнтаў смерцяў. Большасць целаў так і засталіся ўмерзлыя ў лёд Эверэста: у альпіністаў не хапае сіл пасля вымотвальнага ўзыходжання спусціць загінулых у базавы лагер для пахавання. Некаторыя з нябожчыкаў нават служаць арыенцірамі на вышыні — напрыклад, зялёныя чаравікі індыйца Цеванга Палжора, які загінуў у маі 1996 года, адзначаюць вышыню 8500 метраў над узроўнем мора.

Пры гэтым Эверэст — найвышэйшая і самая жаданая вяршыня свету — далёка не самая фатальная гара. Толькі 1-2 працэнты спроб узыходжання на Эверэст заканчваюцца трагічна. Значна больш ахвяр сабраў іншы гімалайскі васьмітысячнік — Анапурна I. Ён забірае жыццё амаль кожнага трэцяга смельчака, які адважыўся скарыць вяршыню. «Гарой смерці» таксама называюць пік K2 на мяжы Кітая і Пакістана, таксама вядомы пад імем Чагоры. Гэта другая па вышыні гара на Зямлі, яна ніжэйшая за Эверэст на 239 метраў. Самая высокая верагоднасць гібелі чакае альпіністаў на трэцяй па вышыні гары свету — Ялунг Канг. Пачынаючы з 2010 года па статыстыцы тры з кожных чатырох спроб заваявання гэтай вяршыні скончыліся фатальна.

Непальскія СМІ адзначаюць, што прычынай масавай гібелі альпіністаў у Гімалаях у гэтым сезоне сталі перш за ўсё цяжкія ўмовы надвор'я і «пробкі» на маршруце. Знаходзячыся занадта доўга ў вышыннай зоне ва ўмовах недахвату кіслароду, заваёўнікі горных вяршынь паміраюць ад знясілення арганізма, мяркуюць спецыялісты. Нягледзячы на такую сітуацыю, урад Непала аб'явіў, што не плануе абмяжоўваць выдачу дазволаў для ахвотных пакарыць Эверэст. Як паведаміў раней генеральны дырэктар дэпартамента турызму Непала Дандурадж Гімір, гэта не першы выпадак, калі на шляху да вяршыні Эверэста назіраюцца «пробкі», а значыць, ва ўладаў «няма падстаў меркаваць», што менавіта яны спрычыніліся да гэтых смерцяў. Значыць, ёсць усе падставы для таго, што фатальны ажыятаж працягнецца.

Захар БУРАК.

# «УСЮДЫ ЖЫВУЦЬ ПРЫЕМНЫЯ, ПРЫЯЗНЫЯ ЛЮДЗІ»

## ВУЧЫЦЕ МОВЫ

— Калі я выбіраю, куды паехаць, заўсёды маю на ўвазе, што адзін з найважнейшых фактараў — мова. Каб мець магчымасць свабодна мець зносіны з людзьмі ва ўсім свеце, дастаткова ведаць тры самыя распаўсюджаныя мовы — англійскую, французскую і іспанскую. Вялікая колькасць краін у свеце — былыя калоніі гэтых трох дзяржаў. Таму, за выключэннем хіба што Кітая і арабскіх краін, усюды можна паразумецца, калі вы ведаеце мовы. Гэта моцна спрашчае жыццё.

Леанід прывёў прыклады, што можа быць, калі не валодаеш мовай краіны.

— Бангладэш — цудоўная краіна, вельмі адкрытыя і таварыскія людзі. Кожны трэці на вуліцы падыходзіць да мяне і спрабаваў завесці гутарку. Але нягледзячы на тое, што гэта былая англійская калонія, амаль ніхто не размаўляе па-англійску. Таму дыялог заўсёды будаваўся па стандартнай схеме. Падыходзіць бангладэшац і кажа: «Хэлоу, віч ё кантры?». Ты адказваеш: «Беларусь». «Ааа-а... окей. Сэнкью». І на гэтым усё, ён сыходзіць. У першы дзень ты думаеш: як выдатна — усе хочуць пазнаёміцца, усім цікава! Але праз дзве-тры дні такіх зносін ты ўжо гатовы ўзмаліцца: ну спытай пра што-небудзь яшчэ! Пагавары пра штосьці яшчэ! Але дзе там! «Беларусь? Окей!». І ўсё.

У Кітаі і Тыбеце таксама катастрофа: англійскай мовай амаль не карыстаюцца. Адзінае, што мяне ратавала, — гэта смартфон і перакладчык Гугл. Ты адкрываеш у смартфоне галасавы перакладчык, гаворыш у яго — той перакладае, затым твой суразмоўца кажа — і смартфон перакладае яго. Толькі так і можна было размаўляць. Там я сустрэў жывога Буду, і менавіта так мы з ім і размаўлялі, прычым даволі паспяхова. Пагаварылі нават пра сэнс жыцця, пра медытацыю...

Хто такі жывы Буда? Пачнём з таго, што ў Тыбеце да гэтага часу амаль адзіны спосаб атрымаць адукацыю — гэта манастыр. Школы там ёсць, але іх пабудавалі кітайцы і, адпаведна, уласна тыбецкай мовы і тыбецкай культуры там няшмат. Прычым многія гэтыя школы далёка не бясплатныя, а ў бедных качэўнікаў-тыбетцаў грошай няма. Таму многія дагэтуль аддаюць сваіх дзяцей у манастыры, каб яны атрымалі там адукацыю, і не толькі школьную, але і ўніверсітэцкую. Манастыры там велізарныя, і ў іх вучацца дзясяткі тысяч чалавек.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У адным з такіх манастыроў адзін чалавек прывёў мяне ў свой пакой, які выглядаў зусім не так, як пакоі іншых студэнтаў: шмат кніг, залатыя кандэлябры і шмат розных прадметаў сегмента лакшэры (раскошы). Потым ён прызнаўся, што ён жывы Буда.

Жывы Буда — гэта традыцыя тыбецкага будызму — перадача ўлады праз рэінкарнацыю. Калі памірае лама (іх там, дарэчы, шмат), лічыцца, што ён пераражаецца ў дзіця, якое пасля павінна заняць яго пасаду. Дык вось, пасля смерці ламы манахі з яго манастыра ездзяць па Тыбеце і па наборы пэўных прыкмет шукаюць дзіця, якое з'яўляецца яго пераражэннем. І гэтага хлопца знайшлі менавіта так. Уявіце, да вас у вёску прыязджае група манахаў і аб'яўляе: ваш хлопчык — жывы Буда. Бацькі з радасцю аддаюць свайго сына ў манастыр! Таму што гэта вялікі гонар, гэтага хлопчыка чакае вялікая будучыня. Яго спецыяльна рыхтуюць да таго, каб ён пасля заняў высокую пасаду. Ніякага сакральнага сэнсу ва ўсім гэтым асаблівага няма, ніякай рэінкарнацыі на самай справе няма. Гэта робіцца таму, што Тыбет заўсёды быў краінай з жорсткай феадальнай структурай. І каб выпадковыя людзі не займалі высокія пасады, там рабілі так: выхоўвалі правільнага, патрэбнага чалавека, які і займаў пасаду.

**Леанід Пашкоўскі атрымаў прызнанне за праект «Хачу дадому» — аб падарожжах у самыя небяспечныя месцы планеты. Яго відэасюжэты, па яго ж уласных словах, — пра такіх жа людзей, як мы, з той толькі розніцай, што яны жывуць ва ўмовах, у якіх мы не хацелі б правесці і дня.**

Гэты хлопец, дарэчы, аказаўся вельмі прыемным. Ён мне казаў: гэта проста традыцыя такая, я звычайны чалавек, проста мне пашанцавала. І, што цікава, гэтая традыцыя цяпер выйшла за межы Тыбета. Шмат тыбетцаў сталі з'язджаць з радзімы, пачалі ўтварацца вялікія камуны тыбецкіх эмігрантаў у самых розных краінах. І цяпер такіх жывых Будаў шукаюць і знаходзяць і ў Аўстраліі, і ў ЗША, і ў Канадзе і г. д. Для чаго гэта робіцца? Каб захаваць тыбецкую культуру і сярод эмігранцкіх камун. Таму што пройдуць адно-два пакаленні — і можа забыцца і мова, і рэлігія, і культура.



З жывым Будам.

Таму ў манастырах і выхоўваюць такога вось Буду, які потым вяртаецца ў сваю камуну і працуе з паствай, каб захаваць тыбецкія традыцыі і культуру. Гэтая старажытная традыцыя аказалася вельмі карыснай для захавання нацыянальнай ідэнтычнасці.

Леанід прызнаўся, што вучыць мовы з адмысловай праграмай на канале Ютуб. Яе стваральнік абяцае навучыць любой з асноўных сусветных моў за 16 гадзін.

— Гучыць як чыстая рэклама, — кажа Леанід. — Але на самай справе, калі я вучыў іспанскую мову, аказалася, што за гэтыя 16 урокаў становіцца зразумелай структура і логіка мовы, якая паказваецца з дапамогай формул, табліц і г. д. Мы ў звычайным жыцці рэдка карыстаемся многімі граматычнымі канструкцыямі, наш штодзённы слоўнікавы запас таксама не вельмі вялікі. Таму, калі зразумець асноўную базу і вывучыць хоць бы 300 слоў, — гэтага можа аказацца дастаткова, каб весці простыя дыялогі з носьбітамі мовы. Вы два месяцы больш-менш старанна вывучаеце мову з дапамогай інтэрнэту — і зможаце потым размаўляць! Справа ўсяго толькі ў матывацыі і трохі — у самадысцыпліне. Прынамсі, на мне гэта спрацавала.

## ПРАДУМВАЙЦЕ ЛАГІСТЫКУ ПАДАРОЖЖА

Як яшчэ падрыхтавацца, асабліва перад паездкай у не вельмі вядомую і зразумелую краіну?

— Для гэтага трэба проста выдаткаваць адзін дзень на тое, каб вывучыць базавыя пытанні: як перамяшчацца, дзе што купляць, як правільна мяняць грошы, што можна рабіць у гэтай краіне, а што непажадана, што можна апранаць, а што нельга і г. д, — кажа беларускі падарожнік. — Гэта значыць, трэба пазнаёміцца з базавым наборам правілаў — і ваша жыццё нашмат спросціцца.

Яшчэ Леанід чытае артыкулы, кнігі, глядзіць фільмы і дакументальныя перадачы пра краіну, у якую збіраецца паехаць.

— Вядома, усе раяць чытаць даведнікі, — кажа ён. — Але гэта нудна, і я вам параю іншае: чытайце кнігі пра гэтую краіну, хай нават мастацкую літаратуру. Бо, нягледзячы на тое, што сюжэт у рамане будзе, хутчэй за ўсё, прыдуманы, усё роўна вы ў нейкай ступені зразумееце, якое жыццё ў гэтай краіне. Вы зразумееце штосьці аб тым, як там людзі адно з адным стасуюцца, вынесеце ўяўленне пра ежу, менталітэт. І гэта дапаможа не ўпасці ў культурны шок, калі жыццёвы ўклад у краіне моцна адрозніваецца ад звыклага вам.

## НЕ БОЙЦЕСЯ ЗАВОДЗІЦЬ НОВЫЯ ЗНАЁМСТВЫ

Перад кожнай паездкай Леанід праз інтэрнэт шукае каго-небудзь з мясцовых, з кім можна пагаварыць, каб лепш зразумець краіну.

— Ёсць, напрыклад, сэрвіс, дзе мясцовыя жыхары прапануюць сябе ў якасці гідаў. Гэта не прафесійныя гіды, але яны могуць расказаць шмат цікавага. Наогул, гэта цудоўна — зірнуць на горад ці краіну вачыма мясцовага жыхара. Можна атрымаць велізарную колькасць новых уражанняў і нейкай новай праўды.

Трэба ўмець знаходзіць з людзьмі кантакт. Для гэтага проста цікаўцеся імі. Калі б вы ведалі, колькі людзей хочуць выгаварыцца! Яны з задавальненнем вам раскажуць усё пра сябе і сваё жыццё, калі ўбачаць у вас уважлівага і зацікаўленага слухача. Асабліва гэта датычыцца краін, дзе мала турыстаў.

І яшчэ трэба ўмець быць трохі нахабным. Я наогул сарамлівы чалавек у звычайным жыцці, у Мінску мне складана падысці да кагосьці пазнаёміцца. Але ў іншай краіне, калі я ў ролі вандроўніка, прымушаю сябе рабіць гэта.

Напрыклад, калі быў на Кубе, то захацеў зняць сюжэт пра сантэрыю — гэта адзін з іх культаў, у нечым падобны на вуду. Неяк ішоў па вуліцы і ўбачыў у акне алтар, побач з якім стаяла вялізная чорная жанчына. Я тут жа пагрукаўся ў дзверы да гэтых незнаёмых людзей. Яны сапраўды праводзілі абрад сантэрыі і сустрэлі мяне вельмі гасцінна. Напаілі ромам, а потым дазволілі зняць відэасюжэт на камеру і ўсё падрабязна расказалі! Так што не трэба баяцца, людзі любяць, калі імі цікавяцца.

* * *

— Падчас падарожжаў я пераканаўся ў тым, што абсалютна ўсюды жывуць прыемныя прыязныя людзі, — кажа Леанід. — У Венесуэле цяпер могуць застрэліць з-за пары долараў, гэта праўда. Але ўсё з-за найцяжэйшага крызісу, а не з-за таго, што венесуэльцы такія дрэнныя. На самай справе там класныя людзі, і ў Мексіцы — таксама. Я ўвогуле лічу, што мексіканцы — гэта такія лацінаамерыканскія беларусы. Яны такія ж простыя, працавітыя і трохі сумныя. Але ўжо калі весяляцца, то на поўную!

**Святлана БУСЬКО.**
**Фота з сацсетак героя.**

---

Турызм

# Маленькія крокі па вялікім горадзе

**У інтэрнэце з'явілася бясплатная інтэрактыўная карта Мінска для дзяцей.**

— Пачынаецца лета, а разам з ім вакацыі. Далёка не ўсе мінчане пакінуць родны горад. Перад бацькамі паўстане заканамернае пытанне: чым заняць сваё дзіця? Мы ведаем адказ. Мэта інтэрактыўнага партала «Адкрый Мінск» — зрабіць жыццё жыхароў і гасцей сталіцы больш насычаным і цікавым, — расказала **Ірына Шлык, дырэктар прадпрыемства «Белкартаграфія»**, якое займалася стварэннем вэб-платформы.

У аснову прадукту легла папяровая карта Мінска. На яе нанеслі інфармацыю пра дзве сотні аб'ектаў і дапоўнілі маляўнічым анімаваным інтэрфейсам.

— Для зручнасці аб'екты падзелены на катэгорыі: славутасці, спартыўныя пляцоўкі, культура і дадатковая адукацыя, адпачынак і забавы. Пад кожным — картка з апісаннем, фотаздымкамі і кантактамі. Пасля агульных звестак ідуць падрабязнасці аб перавагах і ўмовах аб'екта: ці можна тут зарадзіць тэлефон, ці маецца пандус, паркоўка, наколькі далёка ад метро і г. д., — адзначыла **рэдактар Белкартаграфіі Людміла САЛДАК.** — У дзесяткі самых папулярных месцаў ёсць дадатковая інфармацыя. Напрыклад, дзіцячая чыгунка мае віртуальны тур і аўдыягід, а для Мінскага заапарка распрацаваная падрабязная карта-схема з месцазнаходжаннем усіх жывёл.

Паколькі мэтавыя карыстальнікі — дзеці, ухіл быў зроблены на лёгкі пошук аб'ектаў і яснасць падачы матэрыялу. Адрозненне інтэрактыўнай карты ад такіх платформ, як Яндэкс.Карты ці Google.Maps, — магчымасць дэталёва разгледзець асаблівасці Мінска. Дарэчы, падчас работы над праектам выявіліся цікавыя факты пра нашу сталіцу. Так, амаль усе мінскія тэатры знаходзяцца ў цэнтры, а ў паўночнай частцы горада няма ніводнага басейна.

— Пакуль партал даступны ў бэта-версіі па адрасе MapMinsk.by. Зараз мы адкрытыя да цеснага супрацоўніцтва з дзеткамі, якія жадаюць дапамагчы праекту і гатовыя выказаць прапановы і заўвагі на сайце або падчас адкрытага вэбінара 13 чэрвеня, — адзначыў **дырэктар кампаніі, што займаецца распрацоўкай праграмнага забеспячэння карты, Канстанцін ПЯТРАШКА.** — Наступны крок — запуск бясплатнай паўнавартаснай мабільнай праграмы, даступнай у GooglePlay і AppStore. Яна мае модулі віртуальнай рэальнасці, таму «прайсціся» па Мінску можна будзе, знаходзячыся ў любым пункце свету. Акрамя таго, праграма «ажыўляе» і звычайныя папяровыя карты «Белкартаграфіі». Наводзіш смартфон на які-небудзь рэгіён у заалагічным атласе — а там з'яўляецца 3D-слон ці 3D-бусел. Спадзяёмся, што навінку ацэняць не толькі дзеці, але і іх школьныя настаўнікі.

Бліжэй да восені плануецца прэзентацыя яшчэ адной інтэрактыўнай карты — «Мая радзіма — Беларусь».

— Матэрыялы ўжо сабраныя. Гэта будзе вэб-рэсурс адукацыйнага кірунку: дзеці пазнаёмяцца і з архітэктурнай спадчынай краіны, і з народнымі промысламі, і з нацыянальнымі паркамі і запаведнікамі, — расказала **намеснік дырэктара па вытворчасці «Белкартаграфіі» Ала БЕНЕДЗІКТОВІЧ.** — Новы прадукт стане не проста падрабязнай картай, якая раскрывае гісторыка-культурныя аб'екты. Можна будзе паглядзець тэматычныя відэаролікі пра тое, як ствараюцца валёнкі ці саламяныя капелюшы. На карту нанясуць нават народныя строі, характэрныя для розных рэгіёнаў, а таксама геральдычныя знакі гарадоў і вёсак.

**Ганна КУРАК.**

**ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «МИНСКИЙ ЭЛЕКТРОТЕХНИЧЕСКИЙ ЗАВОД ИМЕНИ В. И. КОЗЛОВА» (продавец) извещает о проведении повторного 24 июня 2019 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2**

| |
|---|
| **Номер лота – 1. Капитальное строение** с инвентарным номером 350/С-86422 (наименование: одноэтажное кирпичное здание; назначение: здание специализированное складов, баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), общей площадью 722,3 кв. м с двумя кирпичными пристройками, год постройки – 1981, материал стен – кирпич |
| **Дополнительно сообщаем :** ОАО «МИНСКИЙ ЭЛЕКТРОТЕХНИЧЕСКИЙ ЗАВОД ИМЕНИ В. И. КОЗЛОВА» заключен договор аренды № 69/10 от 20.10.2016 г. по 01.10.2021 г. с ЧП «Саленком», предмет договора – часть капитального строения, которая представляет собой нежилые помещения в одноэтажном кирпичном здании, арендуемая площадь – 106,6 кв. м |
| **Местонахождение:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Иногородняя 1-я, 25А |
| **Информация о земельном участке:** кадастровый номер – 340100000003001502, площадью 0,3761 га; участок для эксплуатации и обслуживания проезда общего пользования (доля в праве – 1/3): кадастровый номер – 340100000003001501, площадью 0,2260 га |
| **Начальная цена продажи с учетом НДС: 91 381,99** бел. руб. |
| **Задаток (5 %) с учетом НДС: 4569,10** бел. руб. |

Объявление ранее опубликовано в газете «Звязда» от 04.05.2019 г.

**Продавец:** ОАО «МИНСКИЙ ЭЛЕКТРОТЕХНИЧЕСКИЙ ЗАВОД ИМЕНИ В. И. КОЗЛОВА», 220037, г. Минск, ул. Уральская, 4, каб. 502.

Контактный телефон 8-017-330-23-82.

**Шаг аукциона – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона (ООО «Деловая оценка»): р/с BY60BELB30121322650030226000** в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, ул. Советская, 71, **БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 20.06.2019 г. в 17.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.**

**Для участия в аукционе предоставляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем (далее ИП) Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юр. лица или ИП, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или ИП Республики Беларусь - нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юр. лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается организатором в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати)** календарных дней с момента подписания протокола; если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **20 (двадцати)** календарных дней после подписания договора купли-продажи; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by**

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, WWW.BELTORGI.BY

Продавец: СООО «Никольстиль» (УНП 290308009) в лице управляющего по делу о банкротстве ООО «Капитал Диалог», тел. +375 29 130 85 30.

Публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) (далее – торги) будут проведены: **2 июля 2019 г**. 09.00 – 17.00 на электронной торговой площадке WWW.BELTORGI.BY.

Предмет торгов – **грузовой фургон MERCEDES-BENZ SPRINTER 313 CDI**, **2001 г. в.,** начальная цена – 5 900,00 бел. руб. без НДС, шаг торгов / задаток – 295,00 бел. руб. Местонахождение – г. Брест, ул. Гоздецкого, 10/1, телефон для ознакомления и осмотра +375 29 698 53 18.

**Для участия в торгах необходимо** в срок по 01.07.2019 г. до 17.00: 1) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY06SOMA30120013860101000933 в ЗАО «Идея Банк», код SOMABY22, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация»; 2) подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте WWW.BELTORGI.BY; 3) направить в отсканированном виде все прилагаемые к заявке документы по адресу: marketing@zalog.by (подробнее – в информации лота на сайте WWW.BELTORGI.BY).

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем торгов в течение десяти рабочих дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи. Обязанность по снятию ТС с государственного учета в ГАИ возлагается на покупателя (по доверенности), а также связанные с этим расходы

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Пуховичский пищекомбинат» в лице антикризисного управляющего Боброва Д. А. в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества в составе

**Имущество ОАО «Пуховичский пищекомбинат»**

| № лота | Наименование объекта | Инвентарный номер согласно данным бухучета | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Размер задатка (10 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| | **Технологическое оборудование для производства плодово-ягодных вин, вспомогательное оборудование и транспортные средства** | | | |
| 1 | **Стерилизатор паровой ВК-75-01, 2007 г. в., заводской № 175** | **Л001127** | **3 600,00** | **360,00** |
| 2 | **Разгрузчик автомобильный У-15-УРАГ** | **ЦПВ0002** | **3 300,00** | **330,00** |
| 3 | **Измерительная система «АЛКО-1-50-10-0,7 бет», заводской № 6090162** | **0001101** | **2 700,00** | **270,00** |
| 4 | **Реактор варочный МЗС-210** | **0001032** | **2 600,00** | **260,00** |
| 5 | **Полуприцеп-цистерна изотермическая на шасси МАЗ – 938020-1011, емкость цистерны 10 куб. м, регистрационный знак отсутствует, цвет – серый, номер кузова (рамы) не читается** | **0001025** | **4 700,00** | **470,00** |
| 6 | **Автомат для наклейки акцизных марок К2-МНА-6-01, заводской № 970024** | **ЛР01220** | **4 200,00** | **420,00** |
| | **Емкостное хозяйство** | | | |
| 7 | Емкость из нержавеющей стали, V=3 куб. м | Числится на счете 08 «Вложения в долгосрочные активы» | **3 000,00** | **300,00** |
| 8 | Сборник для сока, V=2 куб. м | 0001175 | **2 600,00** | **260,00** |
| 9 | | 0001008 | **2 800,00** | **280,00** |
| 10 | | 0001009 | **2 800,00** | **280,00** |
| 11 | Емкость горизонтальная стальная, V=71,9 куб. м | **0001011** | **2 800,00** | **280,00** |
| | **Транспортные средства:** | | | |
| 12 | **Автомобиль грузовой бортовой тентовый МАЗ-533605-221**, 2006 г. в., регистрационный знак АЕ 7799-5, цвет белый, кузов (рама) № Y3M53360560000704 | 0001095 | **2 800,00** | **280,00** |
| 13 | **Микроавтобус грузопассажирский вагон RENAULT TRAFIC 2.0 16V**, 2008 г. в., регистрационный знак АЕ 8855-5, цвет светло-синий, кузов (рама) № VF1JLJWB68 Y271249 | 0001169 | **16 600,00** | **1 660,00** |
| 14 | **Автомобиль легковой седан VOLKSWAGEN PASSAT 2.0 FSI**, 2007 г. в., регистрационный знак 0027 ВН-5, цвет серебристый, кузов (рама) № WVWZZZ3CZ8P007512 | 0001113 | **7 800,00** | 780,00 |
| 15 | **Автомобиль грузовой фургон VOLKSWAGEN CADDY CASTEN MAXI 2.0 TDI**, 2008 г. в., регистрационный знак AI 3355-5, цвет синий, кузов (рама) № W V1ZZZ2KZ9X042835 | 0001185 | **9 300,00** | **930,00** |
| | **Оборудование** | | | |
| 16 | **Аппарат розлива и упаковки жидких продуктов в картонную упаковку типа PURE PAK «Альтер-04А», 2016 г. в., заводской № 1602** | Числится на счете 08 «Вложения в долгосрочные активы» | **38 200,00** | **3 820,00** |
| 17 | **Транспортабельная котельная установка ТКУ-07Г (блочно-модульная котельная со вспомогательным оборудованием), 2006 г. в., заводской № 074** | **0001130** | **31 900,00** | **3 190,00** |
| 18 | **Гамма-радиометр «АТОМТЕХ» РКГ-АТ1320А, 2015 г. в., заводской № 21232** | **ЦС000294** | **6 300,00** | **630,00** |
| 19 | Фильтр-пресс Ш4-ВФП-12, заводской № 104Р198/13 (чугун.) | ЦПВ0165 | **4 100,00** | **410,00** |
| 20 | **Комплект оборудования для выращивания грибов в составе** | | **32 250,00** | 3 225,00 |
| | Программно-технический комплекс оборудования адаптивной вентиляции и микроклимата для выращивания грибов «Тургор АМ» | ЦС 000310 | | |
| | Стеллаж | ЦС000308 | | |
| | Секция стеллажа | ЦС000309 | | |

Шаг аукциона – 10 (десять) процентов.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в следующем размере: по лотам №№ 1–15, 18, 19 – 10 (десять) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лотам №№ 16, 17, 20 – 5 (пять) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.**

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

- заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;

- для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);

- для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);

- для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);

- для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

